Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 57 (5731) | 10 сакавіка 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПРЫВІТАННЕ ІОСІФУ ВІСАРЫЁНАВІЧУ СТАЛІНУ АД УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЫ ЖАНЧЫН НІЗАВОГА СОВЕЦКАГА АКТЫВА.

РАШЭННІ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б) ЗРОБІМ ЗДАБЫТКАМ КОЖНАГА КОМУНІСТА.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Ліквідаваць практыку каптацыі.

Дзякаў — Адроджаная Совецкая Беларусь.

Столін — Палітычныя сляпцы.

С. Галкін — Лепельскія унтэр-прышыбеевы.

І. Турэцкі — Дастойна сустрэць торфсезон другога стаханаўскага года.

А. Лось — У Чачэрску ігнаруюць адказобнікаў.

РЭЦЭНЗІЯ: Кавалёў — «Апошняя ноч».

За рубяжом:

На франтах у Іспаніі.

Пленум Цэнтральнага камітэта комуністычнай партыі Іспаніі.

Фашысцкія дзяржавы сабатуюць ажыццяўленне кантролю.

Італія будуе аўтадарогі ў сваіх калоніях.

Арышты комуністаў у Чэхаславакіі.

Ліквідаваць практыку каптацыі

У статуце нашай партыі запісана: «Кіючым прынцыпам арганізацыйнага будаўня партыі з'яўляецца дэмакратычны нтралізм, які азначае:

а) выбарнасць усіх кіруючых органаў ртыі зверху данізу;

б) перыядычную справаздачнасць парйных органаў перад сваімі партыйнымі ганізацыямі».

Гэты асноўны большэвіцкі прынцып арізацыйнага будаўніцтва нашай партыі многіх партыйных арганізацыях забыты самым грубым чынам парушаны.

Пленум ЦК ВКП(б) на дакладу тав. ланава прама ўказаў, што «выбарнасць ртыйных органаў, устаноўленая статутам партыі, у радзе арганізацый парушана. Устаноўленыя статутам партыі тэрны выбараў парторганаў партарганізацыямі не захоўваюцца. Шырокае расўсюджванне атрымала нічым не апраўдаемая практыка каптацыі розных кіруючых работнікаў у члены пленумаў райкоў, гаркомаў, крайкомаў, абкомаў, ЦК кампартый».

Зусім зразумела, што такая практыка рушэння асноў дэмакратычнага цэнтрызма нанесла велізарнейшую шкоду парйным арганізацыям. Грубае парушэнне статута партыі і прынцыпаў дэмакратычага цэнтралізма, што асабліва ярка выязілася ў адыходзе ад выбарнасці парйных органаў і ўвядзенні непярпімай рактыкі каптацыі, прывяло, як гэта казана ў рашэнні пленума ЦК ВКП(б), абураючай запушчанасці партыйна-алітычнай работы ў Азова-Чорнаморскім раі і ў Кіеўскай вобласці. Гэта добра ыкарысталі злейшыя ворагі для сваёй адрыўной работы супроць партыі і соыялістычнай радзімы.

Практыка грубага парушэння статута артыі мела месца не толькі ў гэтых арганізацыях, яна ў той ці іншай ступені ыла, ўласціва і ўсім астатнім партыйным рганізацыям.

У арганізацыях КП(б)Б мы маем шматікія факты грубага парушэння прынцыпаў унутрыпартыйнай дэмакратыі. ікрозь і ўсюды парушаўся статут партыі аб тэрмінах поўнамоцтваў партыйных органаў. Парткомы пярвічных партарганізацый, не гаворачы ўжо аб большасці аркомаў і райкомаў партыі, на працягу трох год не пераабіраліся і не адчвталіся на партыйных сходах. За гэты перыям часу склад парторганаў не раз мяняўся. яняліся сакратары парткомаў і ніхто не палічыў патрэбным паставіць справаздачу і перавыбары парткома на партыйным сходзе. У Менскай, Гомельскай, Віцебскай, Магілёўскай і іншых партый ых арганізацыях мы маем шматлікія факты, калі сакратары парткомаў пярвічных партарганізацый з моманту перавыбараў мяняліся ад 5 да 10 разоў. Усе яны каптаваліся ў склад партыйных камітэтаў і ніхто з іх не адчтваўся пры іх аклікванні з партарганізацыі.

Калі ўзяць склад пленумаў і асабліва бюро гаркомаў і райкомаў, то яны на сёння складаюцца ў абсалютнай большасці не з абраных на партыйных канферэнцыях, а з каптаваных у розныя перыяды часу.

Вось, напрыклад, з абраных членаў пленума Мсціслаўскага райкома ў студзені 1934 года асталося толькі 6 чалавек. 10 чалавек каптавана. А ў складзе бюро гэтага райкома з 5 чалавек толькі адзін абран на канферэнцыі, а астатнія каптаваны.

Аб тым, да чаго прыводзіць такая практыка, паказваюць лепельскія справы. У складзе бюро Лепельскага райкома партыі толькі адзін аказаўся абраным на партыйнай канферэнцыі, — астатнія былі каптаваны ў склад пленума і бюро райкома. Партыйная арганізацыя не ведала гэтых людзей. Яны перад партарганізацыяй ніякай адказнасці не адчувалі. Будучы не звязанымі з арганізацыяй і бескантрольнымі, яны рабілі рад грубейшых беззаконняў, прывёўшых іх на лаву падсудных.

Калі-б крыцыш унутрыпартыйнай дэмакратыі захоўваўся, калі-б выбарнасць і справаздачнасць партыйных органаў праводзілася, калі-б у арганізацыі была разгорнута большэвіцкая самакрытыка, зусім бясспрэчна Лепельская партыйная арганізацыя папярэдзіла-б тую недапушчальную антыпартыйную практыку, якая праводзілася былым кіраўніцтвам раёна.

Практыка каптацыі, парушэнне тэрмінаў справаздачнасці кіруючых парторганаў і тэрмінаў поўнамоцтваў выбарчых органаў прыводзіла да безадказнасці, аслаблення партыйнай дысцыпліны, зніжала актыўнасць комуністаў і ўзброенасць партыйнаў у барацьбе з ворагам. Гэтым карысталіся трацкісцкая банда і контрреволюцыянеры са зграі Рыкава і Бухарына і ўсе іншыя ворагі, арганізуючы сваю антысовецкую дзейнасць на прадпрыемствах, чыгунках, у калгасах і т. д.

Пленум ЦК катэгарычна прапанаваў: «Ліквідаваць практыку каптацыі ў члены партыйных камітэтаў і аднавіць у адпаведнасці са статутам партыі выбарнасць партыйных органаў.

Забараніць пры выбарах партыйных органаў галасаванне спіскам. Галасаванне правозіць па асобных кандыдатурах, забяспечыўшы пры гэтым за ўсімі членамі партыі неабмежаванае права адводу кандыдатаў і крытыкі апошніх».

Устанавіць пры выбарах парторганаў зачынае (тайнае) галасаванне кандыдатаў.

У бліжэйшы час на аснове рашэння пленума ЦК ВКП(б) будуць праведзены выбары партыйных органаў нашай партыі, у тым ліку і ў Беларусі.

Гэтыя выбары будуць незвычайнымі. Яны будуць з'яўляцца сур'ёзнай праверкай гатоўнасці партыйных арганізацый стаць на чале паваротy, які адбыўся ў краіне ў сувязі з прынятым новай Канстытуцыі. Вось чаму зараз ужо трэба рыхтавацца да выбараў, правяраючы ўсю работу і бязлітасна выганяючы небольшэвіцкую практыку, якая супярэчыць статуту і залачам, што стаяць перад партыяй у сувязі з прынятым новай Канстытуцыі.

Члены партарганізацыі менскай шоўнай фабрыкі «КІМ» на заняттях па вывучэнні рашэнняў пленума ЦК ВКП(б). Фото Вернер (ВСФ).

Рашэнні пленума ЦК ВКП(б) зробім здабыткам кожнага комуніста

ПРАГРАМА РАБОТЫ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

Пленум ЦК ВКП(б), які днямі закончыўся, зойме выключнае месца ў гісторыі нашай партыі. Рашэнні пленума вызначаюць задачы нашай партыі ў перыяд ажыццяўлення Сталінскай Канстытуцыі, знаменуючай сабой гістарычны паварот у палітычным жыцці нашай краіны.

Правядзенне ў жыццё Сталінскай Канстытуцыі, далейшая дэмакратызацыя выбарчай сістэмы з кожным днём усё больш і больш павышае палітычную актыўнасць найшырэйшых пластоў народу. Рашэнні пленума ЦК ВКП(б), прасякнутыя сталінскай мудрасцю, з'яўляюцца магутным інструментам у руках усёй нашай партыі і кожнага комуніста ў паасобку, які дазволіць ўзначаліць актыўнасць мас і накіраваць гэту актыўнасць на ўсямернае ўмацаванне дыктатуры рабочага класа.

Наша партыя, партыя Леніна—Сталіна заслужана карыстаецца бязмежным давер'ем працоўных. Гэта бязмежнае давер'е мас заваявана партыяй на аснове слаўных традыцый большэвіцкага кіраўніцтва масамі, ажыццяўляемага па ленінска-сталінскаму вучэнню — заўсёды перамагаць разам з масамі і на чале мас. Рашэнні пленума яшчэ больш умацоўваюць і ўзнімаюць на небывалую вышыню авангардную ролю партыі і кожнага комуніста.

Пленум ЦК ВКП(б) з выключнай сілай праўдзівасці выкрыў недахопы ў кіраўніцтве партыйных арганізацый, якія зводзяцца да парушэння статута партыі і асноў унутрыпартыйнага дэмакратызма.

Гэтыя ўказанні пленума ЦК ВКП(б) палкам і поўнасцю адносяцца да партарганізацыі Сталінскага раёна горада Менска, дзе парушэнне статута партыі і асноў унутрыпартыйнага дэмакратызма, безумоўна, маюць месца.

У раёне ёсць рад партарганізацый, у якіх парткомы і парторгі на працягу году год не пераабіраліся. Партком завода імя Кірава не пераабіраўся з 1934 года. Такое-ж становішча існуе і ў партарганізацыі фабрыкі «Комунарка», завода імя Варашылава і фабрыкі імя Крупскай і т. д.

Шырока ўжывалася практыка пасылкі і аклікання сакратароў парткомаў і парторгаў у партарганізацыях. Усё гэта стварала вялікую плыннасць кіруючых парткадраў. У некаторых партарганізацыях змянялася за 3 гады да 9 сакратароў парткомаў (завод імя Варашылава, фабрыка «Комунарка», БЭО і рад інш.). Частыя змены сакратароў парткомаў прывялі да таго, што радавыя члены партыі нават не могуць успомніць прозвішча ўсіх сакратароў парткомаў, якія змяніліся ў іх за тры гады. Частая змена сакратароў парткомаў прыводзіла да таго, што парткомы ў цэлым на працягу году год не пераабіраліся. Стварыўшаяся практыка каптацыі асобных членаў парткомаў прыкрывалася тэрмінам «даабірання». У выніку гэтага партком абязлічваўся, не адчуваў сур'ёзнай адказнасці перад партарганізацыяй, зніжалася калектыўнасць у рабоце.

Часта аклікаемыя сакратары парткомаў нават не адчтваліся за сваю работу. Усё гэта змяншала адказнасць кіруючых паркадраў перад членамі партыі, іх выбраўшымі.

На глебе безадказнасці асобных кіруючых работнікаў перад партарганізацыяй вырастала ігнараванне думак радавых комуністаў, заціск самакрытыкі, падхалімства і чынапаважанне. Гэтым карысталіся контрреволюцыйныя трацкісцкія элементы, якім удавалася беспакарана тварыць сваю падрыўную работу. Яркім пацверджаннем гэтага можа служыць справа партарганізацыі рэдакцыі газеты «Звязда», дзе на працягу доўгага часу падвізаўся контрреволюцыянер Розенблюм.

Баязлівасцю самакрытыкі, падхалімствам і сямейнасцю можна растлумачыць факт засмечанасці партарганізацыі менскага мясакамбіната, дзе пры непасрэдным удзеле комуністаў беспакарана арудвала шайка раскрадальнікаў дзяржаўнай уласнасці.

Не лепш была справа і ў партарганізацыі Радыёкамітэта, дзе былы парторг Тучэнка, захапіўшыся адміністраваннем, груба ігнараваў думку асобных членаў партыі і развяліў партработу.

Рашэнне пленума ЦК ВКП(б) аб выключэнні з партыі главароў правых рэстаўратараў капіталізма — Бухарына і Рыкава ў яшчэ большай меры мабілізуе партыю на выкрышчэ да канца ўсіх ворагаў партыі і народу, контрреволюцыйных трацкістаў і іх пасобнікаў.

Рашэнне пленума асабліва абавязвае нас з яшчэ большай сілай весці барацьбу з элементамі зазнайства, ратазейства.

Давядзенне рашэнняў пленума ЦК ВКП(б) да свядомасці кожнага члена і кандыдата нашай партыі, практычнае ажыццяўленне гэтых рашэнняў з'яўляецца неадкладнай праграмай работы партыйных арганізацый.

Сакратар Сталінскага горрайкома КП(б)Б г. Менска ЛІТВІН.

ПАЧАЦЬ РАБОТУ ПА-НОВАМУ

З вялікай цікавасцю сустрэў калектыў фабрыкі імя Кагановіча рашэнні пленума ЦК ВКП(б).

У гутарках, выказваннях на агульнафабрычным мітынгу, у часе чытак разаюцы пленума і прысвечаных ёй перадавых артыкулаў газет комуністы і беспартыйныя рабочыя выказвалі вялікае задавальненне рашэннямі пленума.

— Гэтае гістарычнае рашэнне пленума — яркі доказ магутнасці нашай партыі, упэўненасці ў сабе, сведчанне сапраўднай дэмакратычнасці. Гэту зусім правільную думку партыйнай арганізацыі фабрыкі выказаў комуніст-стаханавец тав. Пеўзнер і выступаўшыя Шкляр, Расоўскі.

Дагэтуль і ў нашай партарганізацыі даволі часта парушаліся прынцыпы дэмакратычнага цэнтралізма. У партыйны камітэт часта «праводзіліся» рэкамендаваныя райкомам людзі, без дастатковага абмеркавання іх канцыдатур на партыйных сходах. Па сутнасці і гэтае абмеркаванне кандыдатур на партыйных сходах у радзе выпадкаў зводзілася больш для захавання ўстаноўленых фармальнасцей. Так, напрыклад, пры выбарах сакратара парткома ў 1935 годзе на сходзе прысутнічала не ўся партарганізацыя, выступленняў па рэкамендуемай канцыдатуры не было. Партыйная арганізацыя фактычна проста згаадзілася з думкай гаркома і моўчкі заверхзіла (афарміла) рэкамендаваную ім кандыдатуру.

Нядаўна ў нас на агульным партыйным сходзе арганізацыі абмяркоўвалася справаздача парткома. Праведзеная папярэдняя праверка работы парткома ўскрыла цэлы рад фактаў парушэння ў той ці іншай ступені прынцыпаў унутрыпартыйнай дэмакратыі. Досыць красамоўна даказвае правільнасць гэтага сцвярджэння хапя-б той факт, што партком ужо на працягу больш трох гадоў не пераабіраўся, даўно страціў сваё поўнамоцтва. З 7 членаў парткома, абраных пры выбарах, зараз працуе толькі трое, чацвера-ж астатніх — каптаваны. Паогул-жа за час існавання парткома каптаваных, а потым аслабанёных членаў парткома аказалася 10 чалавек. (Шамес, Залеская, Грабштэйн, Доўнар і інш.).

Непасрэдным рэзультатам такога становішча з'яўляецца недастатковае пачуццё адказнасці з боку некаторых членаў парткома за сваю работу. Напрыклад, член парткома цэнтральнага яго састава т. Сухімскі ўжо поўгода як не прымае практычнага ўдзелу ў рабоце парткома.

Наша партыйная арганізацыя таксама яшчэ не можа пахваліцца шырока разгорнутай самакрытыкай. Унутрыфабрычны друк (шматтыражка, насценгазеты) працуе яшчэ дрэнна. Аб недастатковым развітай самакрытыцы і некаторым прытуплені рэволюцыйнай пільнасці сведчыць таксама факт выкрыцця трацкістаў Аіна і Каца ўжо пасля праверкі партыйных дакументаў.

Перабудова работы партыйных арганізацый пасля рашэння пленума і ўмацаванне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі выключае ўсялякую магчымасць падобнага становішча. Гэта рашэнне ўзмоцніць у кожным комуністе, абраным у кіруючы парторган, а таксама і ва ўсяго састава парторгана пачуццё адказнасці за сваю работу, актывізуе ўсю партыйную работу, будзе спрыяць большаму разгортванню сапраўды большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі ў партыйнай арганізацыі, вымусіць кіруючых партыйных работнікаў больш чула прыслухоўвацца да заўваг астатніх комуністаў і беспартыйных, павысіць рэволюцыйную пільнасць кожнага комуніста.

З вялікім задавальненнем сустрэла партыйная арганізацыя і ўвесь фабрычны калектыў пастанову пленума аб выключэнні з партыі яе заклятых ворагаў Бухарына і Рыкава. Рашэнне пленума ЦК ВКП(б) патрабуе ад кожнага члена партыі, кожнага непартыйнага большэвіка яшчэ больш настарожыцца, павысіць сваю пільнасць сур'ёзней узяцца за вывучэнне гісторыі нашай партыі.

Наша партарганізацыя наменіла рад практычных мерапрыемстваў па вывучэнню рашэнняў гістарычнага пленума ЦК ВКП(б). Намечана правесці па абмеркаванню рашэнняў пленума агульнафабрычны партыйны сход, рашэнням парткома прапанавана адвесці некалькі заняткаў у сетці партасветы па вывучэнню рашэнняў пленума.

Рашэнні пленума ўскладваюць велізарныя абавязкі на кіраўнікоў партыйных арганізацый і ўсіх комуністаў, ажыццявіць якія магчыма толькі ў рэзультаце вялікай работы, рашучага ўзмацнення сапраўднай сувязі з масамі.

ГЕФЕН.

Сакратар парткома партарганізацыі абутковай фабрыкі імя Кагановіча.

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, родны наш правадыр і настаўнік!

Табе, наш родны, горача любімы таварыш **Сталін**, у Міжнародны комуністычны жаночы дзень 8 сакавіка шлем палкае прывітанне ад Усебеларускай нарады жанчын нізавога совецкага актыва.

Першыя нашы думкі, першае наша слова аб табе, наш мудры правадыр і настаўнік. У гэтых думках мы выказваем вялікую ўдзячнасць табе, наш родны бацька, за наша шчаслівае і раласнае жыццё, якім жыве зараз свабодная, роўнапраўная жанчына Совецкай Беларусі.

Усім вядома, чым раней была беларуская жанчына, забітая, прыгнечаная, непісьменная; яна пярпела падвойны гнёт— сацыяльны і нацыянальны. Нельга без жудасці ўспомніць аб гэтым кашмарным жыцці сёння, калі нашы сэрцы напоўнены радасцю і шчасцем роўнапраўных совецкіх грамадзян.

Дарагі **Іосіф Вісарыёнавіч!** Мы добра ведаем, што гэта шчаслівае жыццё завявана пад тваім мудрым кіраўніцтвам, мы асабліва ўдзячны табе за Канстытуцыю сацыялізма, якая належыць твайму генію. У гэтай Канстытуцыі вогнепымі літарамі записана аб роўнапраўі жанчын ва ўсіх галінах, і гэта з'яўляецца не марамі, а пуўнай сапраўднасцю. Няма той галіны, дзе-б не прымала ўдзел совецкая жанчына. Гераічныя прыклады паказваюць патрыёткі нашай шчаслівай сацыялістычнай радзімы ва ўсіх галінах нашага жыцця. І на сацыялістычных прадпрыемствах, і на калгасных палях, на абаронай рабоце, на навуковым фронце, у советах — усюды мы бачым, як з беззаветнай аддапасцю працуюць нашы жанчыны.

Мы бязмежна ўдзячны табе, дарагі таварыш **Сталін**, за праяўленыя клопаты аб нас, маперах і нашых дзецях. Мы ўдзячны табе за тое, што мацярынства ў нас стала радасцю і шчасцем. Нашы дзеці вучацца ў сталінскіх школах, выхоўваюцца ў палацах піонераў, адпачываюць у санаторыях і лагерах. Мы заўсёды памятаем, што нашы дзеці маюць шчаслівае дзяцінства толькі таму, што яны горача любімы табою; таму імя тваё — най дарагайшае ў свеце імя як для нас, так і для нашых дзяцей.

Абяцаем табе, наш дарагі, родны бацька, вялікаваць у нашых дзецях гарачую любоў да сваёй сацыялістычнай радзімы, мы выхаваем з іх дастойных сыноў сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны.

На нашай наразе прысутнічаюць гераіні сацыялістычнай працы — слаўныя ордэнаносі. Абяцаем табе не шкалаваць сіл, каб да слаўных імён ордэнаносцаў тт. Каўдзеркі, Рыгаровіч, Казарынавай, Канстанцінавай, Вілетнікавай, Башкіравай, Гарэлік, Кісель і раду другіх выхаваць са свайго асяроддзя новых гераінь працы, якімі па праву будзе ганарыцца наша Совецкая Беларусь.

Мы далзім новыя атрады стахановак сацыялістычных прадпрыемстваў і калгасных палёў. Мы пакажам прыклад прадукцыйнасці працы, прыклад барацьбы за высокую якасць прадукцыі.

Мы ніколі не забываем, што жывем на рубяжы з капіталістычным светам. Мы памятаем, што фашысты ў шалёнай нянавісці да Совецкага Саюза рыхтуюць напад на нашу радзіму. Таму мы ўсе свае сілы аддамо на ўзмацненне абароназдольнасці нашай краіны.

І калі толькі патрэбуецца, па закліку нашай роднай комуністычнай партыі мы станем у рады Чырвонай Арміі, каб абараніць наша свабоднае і раласнае жыццё.

Разам з табой, наш друг, таварыш Сталін, мы сумуем па повазу смерці любімага **Серго Орджанікідзе** — твайго бліжэйшага саратніка і друга. Мы ведаем, што яго заўчасную смерць паскорылі тройчы прэзрэнныя ворагі народу—трацкісты.

Мы абяцаем табе, наш родны бацька, яшчэ вышэй узняць нашу рэволюцыйную пільнасць і выкарчаваць да канца агідных ворагаў народу — трацкістаў, правых контррэволюцыянераў, нацыяналістаў розных масцей і т. д. Мы яшчэ шчыльней згуртуем свае рады вакол комуністычнай партыі і цябе, наш любімы **Сталін**.

Пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі мы ўпэўнена пойдзем наперад да новых перамог.

Доўгія, доўгія годы жыві, наш родны таварыш **Сталін**, на радасць нам, жанчынам, на радасць усяго працоўнага чалавецтва!

АДНАДУШНАЕ ЎХВАЛЕННЕ РАШЭННЯЎ ПЛЕНУМА

Рашэнні пленума ЦК ВКП(б) з'яўляюцца дакументам гістарычнага павароту ва ўсім жыцці нашай партыі. Гэтыя рашэнні палітычна выхоўваюць партыйныя кадры і кожнага комуніста ў асобку. Яны ўзнімаюць боездольнасць і актыўнасць нашых партыйных арганізацый, узмацняюць большэвіцкую пільнасць і зоркасць кожнага комуніста. Таму кожны комуніст нашай партыйнай арганізацыі, як толькі былі атрыманы газеты з рэзалюцыямі пленума, стараўся як мага глыбей і ўважлівей азнаёміцца з гэтымі гістарычнымі рашэннямі. Ужо на заняттках гуртка па вывучэнню гісторыі партыі, разбіраючы рашэнні пленума, комуніст т. Яглоўскі заявіў:

— Рашэнні пленума павысяць пачуццё адказнасці кожнага члена партыі і кантроль з боку кожнага члена партыі за работай партыйнага камітэта.

Тав. Радкевіч эвярачае сваю ўвагу на тое, што зараз пры выбарах у кіруючыя партыйныя органы кожны комуніст праявіць больш патрабаванняў да канцыдатуры, якая будзе рэкамендавацца ў склад кіруючага партыйнага органа.

Комуніст Купершток гаварыў, што грубае парушэнне статута і прынцыпаў дэмакратычнага цэнтралізма, асуджанае пленумам ЦК ВКП(б), мела месца і ў нашай партыйнай арганізацыі. І сапраўды, тав. Купершток праў. Партком абран тры з паловай гады таму назад. За гэты час змянялася 7 сакратароў парткома. Ніхто з іх не адчтваўся аб сваёй рабоце, не гледзячы на тое, што агульны сход партыйнай арганізацыі яшчэ ў маі 1936 года пастанавіў правесці справаздачу партыйнага камітэта. Тэрмін паўнамоцтваў камітэта даўно прайшоў.

Большэвіцкае разуменне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі патрабуе, каб кожнае прымаемае рашэнне агульным сходам партыйнай арганізацыі або парткомам неадкладна-б праводзілася ў жыццё і аб выкананні гэтых рашэнняў своечасова было-б інфармавана партыйнай арганізацыі. Гэтага кантролю і справаздачнасці мы не мелі. Рад важнейшых пастаноў і прапаноў комуністаў не праводзілася ў жыццё. А старанная праверка выканання прынятых рашэнняў і паведамленне сходу аб рэзультатах прынятых рашэнняў павышае актыўнасць і адказнасць як парткома, так і партарганізацыі ў цэлым.

Істота ўнутрыпартыйнай дэмакратыі заключаецца таксама ў тым, каб строга захоўваць калектыўнасць у партыйным кіраўніцтве — сумесна абмяркоўваць і пахрыхтоўваць пытанні. У нас на практыцы часта рад членаў партыйнага камітэта не ўпягваюцца ў падрыхтоўку пытанняў за парткома, не заўсёды актыўна ўдзельнічаюць у абмеркаванні пытанняў. Мы не маем выпадкаў, калі-б члены парткома высоўвалі асобныя пытанні для абмеркавання парткома і партарганізацыі. Бясспрэчна, што рашэнні пленума могуць знішчыць гэты сур'ёзны недахоп і забяспечыць сапраўдную калектыўнасць у партыйным кіраўніцтве ў пярвічнай партыйнай арганізацыі.

Рашэнні пленума яшчэ раз падкрэсліваюць непахіснасць статута партыі. У нас-жа статут партыі груба парушаўся. У прыватнасці, у нас партыйныя групы, якія былі створаны з парушэннем статута, падмянялі сабой часта агульныя сходы партыйнай арганізацыі. І з ліквідацыяй партыйных груп мы маем некаторае ажыўленне ў рабоце. Палепшылася сувязь парткома з комуністамі, яшчэ больш узнята адказнасць комуністаў.

Рашэнні пленума патрабуюць ад нас разгортвання работы па-новаму. Рашэнні пленума—гэта праграма ўсёй партыі на працяглы перыяд. Яны павінны быць засвоены кожным комуністам. Надыходзячая справаздача і выбары парткома на пэўставе рашэнняў пленума, як і ўсіх парторганаў, пакажуць небывалы рост актыўнасці кожнага комуніста, разгорнуць вострую большэвіцкую самакрытыку.

Рашэнне пленума аб выключэнні з партыі за антыпартыйную дзейнасць Бухарына і Рыкава абмяркоўвалася на пахавых мітынгах рабочых. Яно цалкам і поўнасцю ўхвалена ўсімі рабочымі. Аднадушным патрабаваннем рабочых было: разграміць да канца ворагаў партыі, аддаць пад суд ворагаў народу.

Б. РАБКІН.

Сакратар парткома фабрыкі «Комунарка».

НЕ АРГАНІЗАВАЛІ ВЫВУЧЭННЯ ВЯЛІКАЙ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

Даклад вялікага Сталіна аб новай совецкай Канстытуцыі слухаў па радыё ўвесь шматнацыянальны народ нашай шчаслівай краіны. Рабочыя, калгаснікі, служачыя не толькі слухалі даклад, але глыбока і ўсебакова вывучаюць яго.

Аднак, як гэта ні дзіва, у Плінскім сельсавеце Ушацкага раёна ёсць рад калгасаў, асобных калгаснікаў, з якімі не арганізавалі ні калектыўнае слуханне даклада, ні яго вывучэнне. Не арганізавалі таксама і вывучэння Сталінскай Канстытуцыі.

Калгаснікі гэтага сельсавета жадаюць ведаць аб дакладзе свайго правадыра, аб новай Канстытуцыі, у якой запісаны нашы заваёвы.

Старшыня сельсавета, ён-жа і парторг, не лічыць сваім абавязкам арганізаваць гэту важнейшую справу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў. Райком партыі адзелаўся толькі тым, што праінструктаваў настаўнікаў сельсавета і на гэтым скончыў сваю місію.

МУРАЎСКІ В. І.

ДА ВЫВУЧЭННЯ КАНСТЫТУЦЫІ НЕ ПРЫСТУПІЛІ

Прайшло больш месяца з таго часу, калі старшыня СНК СССР тав. Молатаў даў указанне аб вывучэнні Сталінскай Канстытуцыі ў старэйшых класах сярэдніх школ. Але да 1 сакавіка ні ў адной школе Дрыбінскага раёна не прыступілі да вывучэння Канстытуцыі, кават не падабраны яшчэ выкладчыкі.

Як відаць, работнікі Дрыбінскага раённага аддзела нарасветы не зразумелі выключнай палітычнай важнасці гэтай справы.

А. ЗЗВЕЛЕЎ.

ЗРЫЎШЧЫКІ НАВУЧАННЯ ДАРОСЛЫХ

Па пытанню навучання дарослых Касцюковіцкі райком партыі і райвыканком не раз выносілі пастановы, вызначалі мерапрыемствы, папярэджвалі загадчыка райана тав. Калюта, але справа не зрушылася з месца. Азнаямленне са становішчам работы школ дарослых выявіла недапушчальныя адносіны да выканання пастаноў партыі і ўрада аб ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці.

Вось Макрынскі сельсавет. Запытваем у старшыні сельсавета тав. Берняк:

— Колькі ўлічана непісьменных і малапісьменных?

— Дзесьці павінны быць спісы, — адказвае Берняк. Але спісаў так і не адшукаў, бо іх няма.

Мы прагледзелі ўсе пратаколы прэзідыума сельсавета і ні на адным пасяджанні, аказваецца, не разбіраліся гэтыя пытанні. Старшыня секцыі ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці т. Савіцкі не ведае нават, дзе працуюць школы дарослых. У сапраўднасці працуюць дзве школы, у якіх вучыцца 49 чалавек, з агульнай колькасці 265 малапісьменных і непісьменных.

У Беладуброўскім сельсавеце навучаецца ў школах дарослых усяго 46 чалавек. У школе холадна, няма святла, нехапае спыткаў і падручнікаў.

Інспектар райана Давыдоўскі і загадчык райана Калюта не ведаюць сапраўднага становішча школ, не кіруюць імі. У райана нават няма дакладнага ўліку непісьменных і малапісьменных па раёну. Праграмы школ дарослых ляжаць без руху ў кніжным магазіне.

Вось чаму ў большасці школы дарослых не працуюць. Работнікі райана бязказна адносяцца да гэтай справы, а райком партыі і райвыканком, выносячы рашэнні, абмяжоўваюцца канстатаваннем фактаў.

С. ФІЛОНЧЫК.

У Міжнародны комуністычны жаночы дзень 8 сакавіка 6 тыс. жанчын Варашылаўскага раёна гор. Менска арганізавалі 5-кіламетровы пераход у працівагазах. На здымку: група ўдзельнікаў пераходу ў часе руху па Совецкай вуліцы.

Фото Я. Салавейчыка.

ПАРУШАЛЬНІКАЎ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ—ДА СТРОГАЙ АДКАЗНАСЦІ

Злачынствы кіраўнікоў соўгаса

Сталінская Канстытуцыя ў артыкуле 127 забяспечвае грамадзянам СССР недатыкальнасць асобы: «Ніхто не можа быць арыштаваны інакш, як па пастанове суда або з санкцыі пракурора».

Аднак кіраўнікі соўгаса «ПСПСВ № 2» (станцыя «Чырвоны бераг» Жлобінскага раёна) груба парушаюць гэтыя правы.

16 студзеня гэтага года рабочы крухмальнага завода № 2 Плахоцкі Алесь ішоў з вёскі Зялёнай Слабады праз тэрыторыю соўгаса да дому ў вёску Гарбачоўская Слабада. На дарозе ў гаі Плахоцкага затрымаў вартаўнік соўгаса Грыгор'еў і пад пагрозай зброі прывёў яго ў кантору.

У соўгасе месяц таму назад была самавольная парубка дроў. Намеснік дырэктара Нядзвецкі і старшыня рабочага камітэта Кміта, не доўга думаючы, рашаюць, што гэта зрабіў Плахоцкі. Яны складаюць акт на парубку 150 дроў і прапануюць Плахоцкаму падпісаць. Апошні падпісаць акт адмовіўся. Самадур Нядзвецкі, аднак, не адставаў. Ён схапіў Плахоцкага за каўпер і пацягнуў ў падвал. На працягу цэлага дня самадур Нядзвецкі здзекваўся над рабочым, трымаючы пад замком Толькі ўвечары, калі ў соўгас прыбегла жонка Плахоцкага, яго выпусцілі з падвала.

Шкодная дзейнасць намесніка дырэктара соўгаса Нядзвецкага не абмяжоўваецца толькі ўказанымі фактамі. Ён свядома выводзіць коней са строю. Не гледзячы на тое, што ў соўгасе ёсць кармы, па яго загаду коней морыць голадам. Некалькі коней пала.

Кіраўнікі соўгаса раскрадаюць дзяржаўную ўласнасць.

2 лютага забілі соўгаснага кабана. Частку сала ад кабана Нядзвецкі забраў сабе.

Старшыня рабочага камітэта Кміта (ён-жа і кладаўшчык) таксама не дае сябе ў крыўду. Кміта падрабляе рахунак на адпускаемыя з кладавой прадукты. (Падрабіў рахунак на 100 кілаграм мукі).

Калі справа датычыць рабочых, гэтыя гора-кіраўнікі даюць волю свайму адміністрацыйнаму запалу. Напрыклад, вартаўніка Лісюка абавязваюць глядзець за свіннямі, якія захварэлі чумой. 14 лістапада пала адна свіння. На акце аб прычынах падзяжу дырэктар соўгаса Конанаў накладае рэзалюцыю такога зместу: «Б/паўшага аднесці за кошт вінаватага Лісюка, які абавязан быў прыглядзець». (Рэзалюцыя прыведзена даслоўна). Бухгалтэрыя вылічвае з Лісюка 79 руб. 80 кап.

26 лістапада старшыня рабочкома Кміта складае акт на рабочага Давыдзенка за тое, што яго карова ела са стогу сена, якое належала соўгасу. Нядзвецкі піша рэзалюцыю: «Утрымаць у размеры нанесеных страт». Бухгалтар Юшкоўскі ўтрымлівае 25 рублёў.

З рабочымі не праводзіцца ніякай культурна-масавай работы. У соўгасе ёсць клуб, але за ўсю зіму яго ні разу не апяплялі. Клуб скарыстоўваецца не па прызначэнню.

На працягу 1936 года ў соўгасе не праводзіліся агульныя сходы рабочых. Ужо чацвёрты месяц рабочым не плацяць зарплаты.

Раённыя арганізацыі і кіраўніцтва санаторыямі і прафілактычнымі ўстановамі зусім не цікавяцца справамі соўгаса. Гэта выкарыстоўвае класавы вораг, які выводзіць коней са строю, псуе сельскагаспадарчы інвентар, расцягвае дзяржаўную маёмасць.

Трэба спадзявацца, што пракуратура рэспублікі прыцягне да адказнасці зарваўшыхся адміністратараў, якія парушаюць Сталінскую Канстытуцыю.

БАРАНОЎСКІ.

ДЛЯ ШКЛОЎСКАЙ МІЛІЦЫІ ЗАКОН НЕ ПІСАН

У студзені міліцыянер Шклоўскага раёна Сердзюкоў, карыстаючыся адсутнасцю маёй маткі, паламаў замок, выкінуў рэчы і заняў яе пакой. Зараз ён таксама здзекуецца з яе, зніваажае яе і заяўляе: «Ты спекулянтка, і я выкіну цябе з хаты».

У Сталінскай Канстытуцыі запісана—«недатыкальнасць жылля грамадзян ахоўваецца законам». Няўжо для шклоўскай міліцыі совецкія законы не існуюць.

Я служу ў Чырвонай Арміі 15 год. Два мае браты — удзельнікі грамадзянскай вайны. Хто-ж даў права здзекавацца над сям'ёй ваеннаслужачага.

Аб усім гэтым я палаваў заявы шклоўскаму раённаму пракурору, начальніку раённай міліцыі і райвыканкамату. Заявіў аб гэтым сакратару райкома партыі. І вось замест прынясця мер да парушальніка Сталінскай Канстытуцыі Сердзюкова, яны маю матку, 75-ці год, выклікаюць на допыты, абыходзяцца з ёю груба і жорстка.

Старшы лейтэнант ЛЕПНЕЎ

ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ ПАСТУПАЦЬ НА ВУЧОБУ

Дырэкцыя віцебскай аўташколы робіць набор курсантаў і патрабуе ад іх прадстаўлення дакументаў аб соцыяльным становішчы. У сельсавеце такіх дакументаў зараз не выдаюць і спасылаюцца на адпаведныя пункты Сталінскай Канстытуцыі, згодна якой грамадзяне СССР маюць права на асвету без усякіх абмежаванняў.

Дырэкцыя віцебскай аўташколы віхаўчна не вывучала яшчэ як належыць гістарычны дакумент нашай эпохі — асноўны закон СССР. Інакш яна-б не стварала перашкод для паступлення ў школу.

КУКІН, МАШКАРОЎ.

ПАД БОКАМ РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

(Пісьмо вучня)

Загадчык крупскай раённай бібліятэкі Г. Т. Дорахаў груба адносіцца да чытачоў абзывае іх усякімі брудными словамі. Нядаўна быў такі выпадак: адзін чытач папрасіў Канстытуцыю, а Дорахаў з лаянкай выштурхнуў яго за дзверы.

Бібліятэка не ачышчана ад трацкісцкай літаратуры. Калі-ж папросіш тыя або іншыя тамы Леніна, то Дорахаў кажа: «Гэтага вам нельга чытаць».

Пры бібліятэцы ёсць два пакоі чытальні, але яны амаль заўсёды закрыты. Вечарамі Дорахаў збірае кампанію і запершыся ў чытальні, п'янствуе.

В. ГЕРАСІМОВІЧ.

***

Крупская бібліятэка абслугоўвае, галоўным чынам, чытачоў раённага цэнтра, сярод якіх пераважна вучнёўская моладзь. У мінулым годзе для бібліятэкі адведзена добра абсталяванае памяшканне з двума ўтульнымі пакоямі чытальні, створаны ўсе ўмовы для таго, каб бібліятэка стала сапраўдным арганізуючым культурным ачагом.

Некалькі месяцаў таму назад бібліятэчнае кіраўніцтва Наркомасветы БССР прыслала новага загадчыка бібліятэкі Г. Т. Дорахава. Чым вызначылася работа бібліятэкі з прыездам новага загадчыка — яскрава паказвае пісьмо вучня Герасімовіча. Недапушчальна грубыя паводзіны і лаянка Дорахава агульнавядомы для наведвальнікаў бібліятэкі. Дорахаў пайшоў далей гэтага. Вучня 6-га класа Сухачоўскага Сямёна ён проста выштурхнуў з памяшкання, вучань ударыўся аб дзверы, разбіў твар. І ніхто не суняў хуліганствуючага загадчыка бібліятэкі.

У часе апошняга пераўчоту ў бібліятэцы была выяўлена значная колькасць варожай літаратуры, сярод якой кнігі з артыкуламі Троцкага і яго контрэволюцыйнага ахвосця, асуджанага па нядаўных працэсах. Ні ўпаўнаважаны райліта тав. Турэцкі, які правяраў бібліятэку, ні прымацаваная да бібліятэкі загадчыца партгабінета тав. Фарбман не надалі гэтаму значэння. Кнігі да самага пераўчоту ляжалі на паліцах бібліятэкі разам з астатняй літаратурай.

Нават пасля пераўчоту бібліятэка астаецца засмечанай. Вучань-сямікласнік бярэ пераклад англійскага рамана.

— Ды гэта-ж з прадмовай Радэка! — здзіўляецца ён. Дорахаў праглядае кнігу і моўчкі аддае яе чытачу.

— Дайце мне аднатомнік Леніна—Сталіна, — зварачаецца другі вучань.

— Не дарос яшчэ, — груба адказвае Дорахаў, і вучань, які праз пару год канчае сярэднюю школу, баючыся супярэчыць, выходзіць з пакоя.

Пустыя чытальныя пакоі — без газет, без кніг і без наведвальнікаў, засмечаныя кніжныя паліцы, антыграмадскія паводзіны загадчыка — такі непрыглядны малюнак характэрны для бібліятэкі.

І дзіўным з'яўляецца, што ўсё гэта робіцца ў раённым цэнтры пад бокам раённых арганізацый.

4 сакавіка Крупскі райком партыі паведаміў рэдакцыі, што Дорахаў знят з пасады «за дрэнную работу і грубыя адносіны да наведвальнікаў». Відаць, знімаўшыя з работы не ўлічылі, што абураючыя ўчынкі Дорахава і падрыў ім работы бібліятэкі былі невышадковымі. Атрыманыя рэдакцыяй пісьмы сцвярджаюць, што з бібліятэкі на абвёртку ў крамы пападалі такія кнігі, як «Мой метад» — Стаханава і інш., што Дорахаў да апошняга пераўчоту трымаў трацкісцкую літаратуру, не адзін раз выштурхоўваў і абіваў піонераў—наведвальнікаў бібліятэкі. Яўна варожая дзейнасць Дорахава асталася фактычна беспакаранай.

Крупская бібліятэка патрабуе сур'ёзнага аздараўлення, а не фармальнай змены загадчыка.

Т. ХАДКЕВІЧ.

РАЗБАЗАРВАЮЦЬ ХЛЕБАЗАКУПАЧНЫЯ ТАВАРНЫЯ ФОНДЫ

Атаварванне хлебазакупак — адзін з важнейшых вагароў выканання плана. Выручаючы таварныя фонды для гэтай справы, дзяржава патрабуе ад усіх арганізацый правільнага скарыстання іх. Аднак, у раёне раёнаў маюць месца злоўжыванні таварнымі фондамі хлебазакупак. Вось факты. Уваравіцкі райсаюз атрымаў 10 веласіпедаў і некалькі гадзіннікаў для атаварвання хлебазакупак. Палова гэтых тавараў папала чамусьці не калгаснікам, а ў рукі работнікаў райаддзялення Дзяржбанка. Веласіпеды атрымалі: галоўбух банка Багачэнка, Шэвелеў, Цырульнікаў, а касір Сапрыцкі атрымаў нават два веласіпеды адразу. Работнік банка Эціна атрымала веласіпед, атрымаў і гадзіннік.

Калгас «Чырвоны Бастрычнік», Валкоўскага сельсавета, Талачынскага раёна атрымаў за праданы дзяржаве хлеб адзін веласіпед і двое гадзіннікаў. Ні тое, ні другое не дасталося калгаснікам. Веласіпед узяў сабе дырэктар няпоўнай сярэдняй школы Філіпаў, а 2 гадзіннікі — старшыня райсаюза Вайнер.

Такія факты ў Талачынскім раёне не адзінкавыя.

Пракуратура рэспублікі павінна запіхавіцца гэтымі справамі і прыцягнуць вінаўных у разбазарванні дзяржаўных фондаў хлебазакупак да адказнасці.

Г.

МЕДРАБОТНІК, ЯКІ ХАВАЕЦЦА АД СВАІХ ПАЦЫЕНТАЎ

У Сваржэнскім сельсавеце (Журавіцкі раён), як і ва ўсіх сельсоветах, ёсць медпункт з усім неабходным для яго абсталяваннем. Але яго загадчык Фільшаровіч не лічыць сваім абавязкам бесперабойна і добрасумленна абслугоўваць насельніцтва. Ён заўсёды стараецца ўвільнуць, калі яго выклікаюць да хворых. Для таго, каб не прымаць пацыентаў, ён рэдка бывае на прыёме, хаваецца ў сябе дома. У лепшым выпадку, гэты медработнік, з дазволу сказаць, зачыняецца ў медпункце, а калі прыходзяць хворыя, ён ім адказвае: «Прапаў ключ, няма чым адчыніць дзверы». Сваімі агідным павозінамі Фільшаровіч прымушае хворых хадзіць за 12 кіламетраў у другі медпункт.

НІКАЛАЕЎ

ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ ВЫДАЧУ ЗАРПЛАТЫ

Кльская арцель «Чырвоны хімік» сістэматычна не выконвае плана. За мінулы год план выканан на 46 проц. Тлумачыцца гэта адсутнасцю тэхнічнага кіраўніцтва вытворчасцю з боку праўлення. Напрыклад, былі выпадкі, калі з-за нястачы вапны на працягу месяца адбываліся прастоі. Калі-ж вапна прыбыла, яе выгрузілі пад адкос, бо праўленне загадзя не падрыхтавала склад. Значная частка вапны папсавалася. Рабочым па 2—3 месяцы не плоцяць заработнай платы. З банка-ж праўленне атрымлівае заработную плату кожны месяц. Куды дзяюцца грошы — невядома.

РАБОЧЫ.

ДЗЯКАЎ

Народны камісар асветы БССР.

АДРОДЖАНАЯ СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ*)

Чорным, дзікім, пакутнейшым было мінулае беларускага народу. Тысячамі паміралі людзі ад голаду і хваробы. Беларуская мова каралася з усёй бязлітаснасцю. Царскія сатраны прымалі ўсе меры для таго, дабы «русский язык был везде господствующим, как и надлежит быть в русском краю». Аб насаджэнні пісьменнасці ў народзе, развіцці справы народнай асветы не магло быць і гутаркі. На тэрыторыі сучаснай Беларусі раней існавала ўсяго 67 сярэдніх школ, у якіх навучаліся толькі дзеці дваран, купцоў, духавенства, чыноўнікаў і кулакоў.

Афіцыйны перапіс пачатковых школ, праведзены 18 студзеня 1911 г. у Віленскай вучэбнай акрузе, паказваў, што на 100 жыхароў прыходзілася толькі 3,66 вучняў. На адну пачатковую школу прыходзілася 11,3 вёскі. Цікава апісвае само міністэрства пра школьныя будынкі і становішча настаўнікаў: «Настаўнікі, — пішацца ў справаздачы па перапісу, — са сваімі вучнямі вандруюць з вёскі ў вёску, з хаты ў хату, астаючыся ў кожнай хаце адпаведны лік дзён, звычайна 7 дзён. Так як лік вучняў у гэтых школах нязначны (у сярэднім ад 15 да 20 чалавек), то ўся сям'я гаспадара лічыць магчымым аставацца ў гэтай хаце ўвесь час класных заняткаў, а зімой у халодныя дні ў класную хату дапускаюць і дробную хатнюю жывёлу. Настаўнік у такой перасовачнай пачатковай школе карыстаецца кватэрай і сталом ад гаспадароў і, звыш таго, зарабляе грашыма ў сярэднім ад 25 да 30 рублёў у зіму. З прычыны нязручнасці памяшкання, сярэдні навучальны год у гэтых школах, у сярэднім, не больш 130 дзён» («Однодневная перепись начальных школ империи. Виленский учебный округ. С.-Петербург. 1914 г.»).

Вышэйшых школ не было ні адной. А калі ў 1912 годзе менскае земства звярнулася ў міністэрства народнай асветы з просьбай адчыніць універсітэт, то яму адказалі, што ў чарце яўрэйскай аседласці адчыненне вышэйшых навучальных устаноў лічыцца немагчымым.

І вось гэта цяжкае мінулае, пакутнае для працоўных мас, ворагі народу, беларускія контрэволюцыйныя нацдэмы называлі «залатым векам».

Якую велічную карціну, захапляючую росквітам сацыялістычнай гаспадаркі, культуры, навукі, мастацтва, шчаслівага, раднаснага жыцця ўяўляе сёння Совецкая Сацыялістычная Беларусь!

Совецкая Беларусь адна з першых увяла ўсеагульнае абавязковае пачатковае навучанне. Толькі адна шостая частка дзяцей школьнага ўзросту была ахоплена школамі да Вялікай Пролетарскай Рэволюцыі, а зараз у нашых совецкіх школах навучаецца 1.017 тыс. дзяцей працоўных Совецкай Беларусі. У нас ёсць зараз 7.037 школ.

Толькі за 1936 год пабудавана ў БССР 86 новых сталінскіх школ, гэтых сапраўдных палацаў асветы, на якія выдаткавана 17 млн. рублёў. Велізарны план будаўніцтва школ зацверджан на 1937 год. Усяго намечана пабудаваць у 1937 годзе 63 школы на 19.400 вучнёўскіх месц, у тым ліку сельскіх школ — 49 і гарадскіх 14, усе гарадскія — сярэднія школы з колькасцю вучнёўскіх месц 8.960. Затраты, вызначаныя на будаўніцтва школ па БССР, у гэтым годзе складаюць 17.077 тыс. руб. Аб размаху школьнага будаўніцтва, якое праводзіцца ў выніку велізарных клопатаў з боку нашай партыі і вялікага Сталіна аб школе і дзецях, гаворыць хаця-б той факт, што за апошні год мы пабудавалі ў Менску ў паўтара раза больш усяго існаваўшага да гэтай пары школьнага фонду, а калі параўнаць тое, што будаваў царскі ўрад, то мы толькі за адзін 1936 год пабудавалі больш, чым царскі ўрад будаваў у стагоддзі. Палову мільярднага бюджэта БССР складаюць выдаткі на асвету, навуку і культуру.

Мы маем у БССР 1914 сярэдніх і няпоўных сярэдніх школ, у якіх навучаецца 637.489 вучняў. Толькі ў 1936 годзе намі адчынена 93 сярэднія школы.

Пролетарская дзяржава выдаткоўвае велізарнейшыя сродкі на абслугоўванне і выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту. У БССР каля 100 тысяч дзяцей ахоплена дзіцячымі садамі. Велізарнейшы план будаўніцтва дзіцячых садоў зацверджан на 1937 год. Толькі па лініі Наркомасветы ў 1936 годзе пабудавана 14 дзіцячых садоў. Па плану 1937 года адпушчана 7 мільёнаў рублёў на будаўніцтва 38 дзіцячых садоў на 2.850 дзяцей.

Велізарнейшая маса дарослага насельніцтва ахоплена як агульным, так і тэхнічным навучаннем. Па БССР функцыянуюць 950 школ павышанага тыпу, у якіх атрымліваюць сярэднюю асвету дарослыя рабочыя і калгаснікі. Апрача таго мы маем у БССР 28 рабфакаў.

Зараз у БССР 23 вышэйшыя навучальныя ўстановы, у якіх навучаецца 15.265 студэнтаў. Больш 80 проц. студэнтаў атрымліваюць дзяржаўную стыпендыю ў размеры ад 90 да 250 рублёў.

Якое змрочнае становішча справы асветы ў краінах, дзе пануе капітал! Па даных «Статистического ежегодника», за 1936 год у Польшчы выдаткі на асвету скарочаны былі ў параўнанні з 1935 годам амаль на адну трэць. Згодна слоў самога «Статистического ежегодника», вельмі абмежаваная сетка школ Польшчы і асабліва ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне скарачаецца з года ў год. У існуючых пачатковых школах у Польшчы прыходзіцца 37 вучняў на аднаго настаўніка.

Газета «Кур'ер паранны» у нумары ад 8 верасня 1936 года пісала, што колькасць дзяцей, пазбаўленых элементарнага навучання, даходзіць да 1,5 мільёна чалавек.

У нумары ад 22 верасня 1936 года «Кур'ер паранны» вымушан таксама прызнаць, што школьнікі «ў Польшчы галадаюць. Праўда, — піша газета, — дзеці ўжо прывыклі да сістэматычнага недаядання».

Вясковая моладзь пазбаўлена доступу да асветы ў Польшчы. «Кур'ер віленскі» у нумары ад 18 верасня 1936 года пісаў: «Доступ у сярэднія навучальныя ўстановы маюць толькі тыя, хто мае магчымасць прадставіць пасведчанне аб сканчэнні 6 класаў народнай школы, а пераважны тып школы на вёсцы гэта—школа аднакласная або двухкласная. Такім чынам вясковыя дзеці амаль не маюць доступу ў гімназію. Вясковая моладзь не мае часта доступу ва універсітэты таму, што не кожны мае магчымасць унесці галавую плату ў суме 300 злотых, а таму ва універсітэтах пераважным элементам з'яўляецца гарадская моладзь. Часта моладзь пасля сканчэння універсітэта не мае ніякіх перспектыў атрымаць работу. Сярод іх лютае вялікае беспрацоўе.

Вось, напрыклад, такі момант: з дому ў дом заходзяць прадаўцы гліняных гаршкоў. Часта гэтым прадаўцом з'яўляецца студэнт, або скончыўшы універсітэт урач, адвакат і т. д.».

У сувязі з пачаткам навучальнага года ва універсітэтах «Кур'ер віленскі» ў нумары ад 7 кастрычніка 1936 года звярнуўся з наступнымі парадамі да новапаступаючай туды моладзі:

«У сувязі з тым, што грамадства церпіць ад празмернай вытворчасці інтэлігенцыі, падумайце, што вы робіце. Бо мы (старая інтэлігенцыя) таксама хочам жыць, а вы ўсе хочаце стаць інтэлігентамі. Лепш паступайце ў тэхнічныя школы, у армію, ужывайце стрыхнін. Наша краіна ўжо дастаткова адукавана і яна ў вас больш не мае патрэбы. Што-ж нам рабіць? — запытаецца вы з гораччу. Вяжыце панчохі, драбіце каменні, жрыце бульбу, а калі вы будзеце супярэчыць, то мы выганім вас са школы, бо барані божа хто-небудзь з вас яшчэ будзе надта адукаваны, а наша краіна не мае патрэбы больш у інтэлігенцыі».

Так пішуць самі фашысцкія газеты Польшчы.

Працоўныя масы Заходняй Беларусі пазбаўлены магчымасці вучыцца на сваёй роднай мове.

«Беларуская крыніца» у нумары ад 15 верасня 1936 года пісала: «Пачатковая асвета беларускіх дзяцей у польскіх дзяржаўных школах (апрача 69 школ, у якіх — згодна слоў віленскага школьнага пячыцеля — «беларуская мова прынята пад увагу», праводзіцца на польскай мове; адзіны ў краіне беларускі філіял пры ўрадавай гімназіі імя Славацкага ў Вільні не задавальняе патрэбы беларусоў у сярэдняй школе».

І антысовецкай брахнёй з'яўляецца заява пана Валеўскага ў польскім сейме аб тым, што ў СССР абмежавана навучанне для нацыянальнасцей. Няхай паглядзіць гэты пан у сябе, у сваёй краіне. Ён убачыць, як там паўтара мільёна дзяцей, зусім пазбаўленых школы. Фашызм зачыняе школы, скарачае іх лік, а існуючыя школы ператварае ў казарму, у муштру, дзе выкладанне праводзіцца фельдфебелямі і пабудавана на багаслоўі.

А ў нас, у краіне Советаў, у краіне сацыялізма, працоўныя масы ўсіх нацыянальнасцей карыстаюцца аднолькавымі правамі. У нас выкладанне ў школе забяспечана на роднай мове. У нас існуюць школы 10 нацыянальнасцей: беларускай, рускай, яўрэйскай, польскай, украінскай, латышскай, літоўскай, эстонскай, нямецкай, цыганскай.

У БССР зараз налічваецца 28.896 настаўнікаў, замест 6.000 у дарэволюцыйны час. Совецкія настаўнікі і совецкая школа — гэта велізарнейшая сіла ў справе будаўніцтва бясклясавага сацыялістычнага грамадства.

Выкладанне Канстытуцыі Саюза ССР у школах, згодна ўказанняў тав. Молатава, мае велізарнейшае значэнне ў справе комуністычнага выхавання вучняў. Выкладанне Канстытуцыі яшчэ больш узмоцніць у дзяцей любоў за комуністычнай партыі, да нашай социялістычнай радзімы, да правадыра працоўных вялікага Сталіна, яшчэ больш узніме нянавісць да ворагаў народу.

Контрэволюцыйнае ахвосце разгромленых подлых, гнусных ворагаў народу — трацкісцка-зіноўеўскіх бандытаў і контрэволюцыйных нацыяналістычных элементаў, — пралезшае дзе-ні-дзе ў рады настаўніцтва і органы народнай асветы яшчэ не выкрыта да канца. Азвярэлыя, асуджаныя на пагібель, разбітыя, але яшчэ не знішчаныя да канца ворагі народу захаваўшыяся дзе-ні-дзе, працягваюць сваю брудную шкодніцкую работу ў той ці іншай школе або тэхнікуме, ВНУ і ў саміх органах народнай асветы.

Нядаўна выкрыты і выгнаны з Наркомасветы абаронцы беларускіх контрэволюцыйных нацдэмаў работнікі Наркомасветы Альхавік і Ванькевіч. Яны, добра ведаючы контрэволюцыйны твар высланых нацдэмаў Смоліча і Адамовіча, аказвалі гэтым ворагам народу прамую дапамогу шляхам высылкі ім адпаведных даведак. У паасобных школах Талачынскага раёна арудвалі вораті народу—контрэволюцыйныя трацкісты (былы дырэктар Высокагарадзецкай НСШ Шыцькоўскі і былы дырэктар Няклюдаўскай НСШ Кабачаўскі, былая настаўніца 1 Талачынскай НСШ Касценіч, былы завуч гэтай школы Крэдзька. У Смалявіцкай сярэдняй школе выкладчык нямецкай мовы Шкляр на ўроку выявіў свой фашысцкі твар і выкрыт як фашыст самімі вучнямі.

Калі ў Наркомасветы паступілі матэрыялы талачынскага райкома партыі аб гэтай контрэволюцыйнай зграі, туды паехаў начальнік кіраўніцтва сярэдняй школы Наркомасветы Хейфец. І замест ачысткі совецкай школы ад гэтых ворагаў ён змазаў справу, пакінуўшы на рабоце гэтых нягоднікаў. Як зараз устаноўлена, Хейфец месяцамі трымаў пад сукном сігналы з месц аб шкодніцкай рабоце ворагаў. Хейфец знят з работы ў Наркомасветы.

Усё гэта гаворыць аб тым, што апарат Наркомасветы і яго органы на мясцах яшчэ не цалкам ачышчаны ад варожых элементаў.

Цудоўнай, узроджанай стала Совецкая Беларусь! Яна стала такой дзякуючы бязлітаснаму разгрому ворагаў народу — беларускіх контрэволюцыйных нацдэмаў, гэтых шпіёнаў, агентаў фашысцкай контрразведкі.

Партыя большэвікоў бязлітасна разграміла гэту звярыную зграю правакатараў з іх атаманамі Ігнатоўскім, Баліцкім, Лёсікам і інш.

Дыктатура пролетарыята, ленінска-сталінская нацыянальная палітыка падняла да шчаслівага жыцця народы БССР.

Кожны працоўны Совецкай Беларусі з любоўю носіць у сваім сэрцы імя любімага настаўніка і бацькі вялікага Сталіна.

*) З выступлення на Надзвычайным XII Усебеларускім З'ездзе Советаў.

ДАСТОЙНА СУСТРЭЦЬ ТОРФСЕЗОН ДРУГОГА СТАХАНАЎСКАГА ГОДА

Тарфяная прамысловасць БССР павінна [illegible] сёлета народнай гаспадарцы да 3 [illegible]ёнаў тон торфу. Прырост прадукцыі [illegible] нашай рэспублікі значна перавышае [illegible]лні прырост гэтай галіны па ўсяму [illegible]зу. Адсюль зразумела, якія вялізарныя [illegible]чы стаяць перад тарфянікамі.

[illegible]а адбыўшымся ў Менску вызным [illegible]куме ЦК саюза тарфянікаў быў заслу[illegible] даклад кіраўніка Белторфа т. Кузня[illegible]. Прыведзеныя ім факты сігналізуюць [illegible]лікай пагрозе ў своечасовым пачаццу торфаздабычы.

[illegible]а намечанаму плану ўсё абсталяван[illegible] торфазаводаў павінна быць поўнасцю [illegible]на да работы к 10 красавіка. Між [illegible] на сённяшні дзень яшчэ нехапае 9 [illegible]мабільных паравых установак, што [illegible]лае 18 проц. усіх пара-сілавых устаак траста.

[illegible]а гідраторфу патрэбна пусціць 4 кра[illegible]. Краны ёсць, а абсталявання да іх ня[illegible]. Да пачатку сезона два краны не бу[illegible] забяспечаны электрачасткамі. Нахаматораў, кабелю, 400 тон масапра[illegible]ных труб, 20 тон сталёвых труб вы[illegible]ага даўлення. Нават невядома, калі [illegible] прыбудуць.

[illegible]елторф, а таксама Наркаммясцпром да[illegible]ілі тут вялікую «спрытнасць», а за[illegible] яны самадзяльна канстатуюць факт [illegible] няма абсталявання. Аддзелы траста [illegible]ведаюць, што робіцца на заводах. На [illegible]одзе «Дукора» ўжо тры гады будуецца [illegible]ўляны інтэрнат і ніяк яго не скон[illegible].

[illegible]лачыная надбайнасць трэстаўскіх кі[illegible]нікоў адбіваецца ў першую чаргу на [illegible]роце аднаго з буйнейшых яго прадпры[illegible]таў — «Асінторфе», які з года ў [illegible] не выходзіць з прарыву, завод, які [illegible]даў да 11 мільёнаў рублёў страт. [illegible] 1936 годзе «Асінторф» выканаў план [illegible] 94 проц. На палях асталося 73 тыс. [illegible] торфу. Да новага сезона патрэбна [illegible]рыхтаваць 300 гектараў для спілкі, [illegible]0 гектараў раскарчаваць для здабычы [illegible]0 гектараў успаліраваць для палёў разу для вялікага гідраторфу. Аднак уся [illegible]а плошча яшчэ занята мінулагоднім [illegible]фам.

Асабліва востра абстаіць справа на за[illegible]ах з забеспячэннем рабочых інтэрна[illegible]ці. На сённяшні дзень ёсць толькі 65 [illegible]ц. неабходнай жыллёвай плошчы. На «Асінторфе» нехапае плошчы для 1039 [illegible]лавек. Старыя інтэрнаты таксама не [illegible]амантаваны. Лазня развалена, няма [illegible]нту для рамонту. Колькі разоў дырэк[illegible]я звярталася да Торфтэхснаба за дапа[illegible]гай, але-ж гэтых гора-кіраўнікоў мала [illegible]бае тое, што 6 тыс. чалавек на бу[illegible] ёсць дзе памыцца.

У мінулым годзе на тарфяных палях [illegible]раслі тысячы стахановаў, якія пака[illegible]лі ўзоры высокай прадукцыйнасці пра[illegible]. Але-ж поспехі маглі-б быць значна [illegible]льшымі. Даволі сказаць, што 30 проц. [illegible]ючых не выконвалі сваёй нормы. На [illegible]зе заводаў («Асінторф», імя Даумана) [illegible]бочым не стваралі самых неабходных умоў для работы, не давалі інструментаў (шуфляў, лапат) і ў той-жа час патрабавалі ад іх выканання нормы. Машыны не дагледаліся і выходзілі часта са строю. Учот працы і арганізацыя зарплаты была нікудышнай. Тарфянікі не ведалі па паўтара месяца свайго заработку. Кіраўнікі заводаў у многіх месцах займаліся адміністраваннем, а не вучылі людзей. Гэтыя ўрокі павінны быць улічаны ў новым сезоне.

Ужо зараз ёсць рад сігналаў аблічвання тарфянікаў і несвоечасовай выплаты належачай ім прагрэсіўкі.

Выступіўшы на пленуме вядомы стахановец брыгады капаўшчыкаў «Асінторфа» Сімчанка расказаў як на заводзе здзекваюцца над яго брыгадай. Прарабам іх участка прызначан нейкі Пятроўскі, які быў нядаўна ўволен з завода за гаўнение на стахановцаў. Гэты самы Пятроўскі зараз працягвае свае агідныя справы. Рабочым капаўшчыкам не аплачвае за работу па ачыстцы снегу, раскарчоўцы балота звыш 8 сантыметраў, за большую шпістасць, хоць усё гэта па закону прадугледжваецца. Ён не выпісвае нарадаў рабочым, і яны не ведаюць сваіх расцэнак. З 34 чалавек у брыгадзе асталося 12. Аб гэтым паступіла заява галоўнаму інжынеру Белторфа Спіпанаву, але-ж ён не знайшоў патрэбным расследаваць гэтыя факты. Можна прывесці шматлікі фактаў нячулых, бюракратычных адносін да жывых людзей на заводзе імя Даумана, «Большэвік», дзе заклятыя ворагі народу спакойна праводзілі сваю шкодніцкую работу.

Масава-палітычная работа партыйных арганізацый і профсаюзаў вялася зусім слаба. Усё культурнае абслугоўванне тарфянікаў заключалася ў арганізацыі танцаў.

Старшыня ЦК саюза тарфянікаў тав. Бедаржыцкі расказаў членам пленума ЦК як прафсаюзы рыхтуюцца да сустрэчы новай масы рабочых. Вялікія планы намечаны, а практычна яшчэ нічога не зроблена. Для радыё нехапае дроту, для кіноўстановак адсутнічае пастаянны ток, клубаў няма — вось аб'ектыўныя прычыны, якімі аргументаваў сваю бяздзейнасць тав. Бедаржыцкі.

Да пачатку торфсезона асталося ўсяго 3—4 тыдні. Час кароткі, а недаробак шмат. Кіраўнікі торфзаводаў пры дапамозе траста і Наркаммясцпрома давінны напружыць усю сваю энергію, каб сустрэць торфсезон другога стахановскага года ва ўсеўзброенні.

Канструктары, інжынерна-тэхнічныя работнікі, стахановцы і ўдарнікі тарфяной прамысловасці БССР абяцаюць па зварот стахановцаў вугальнай і металургічнай прамысловасці Данбаса новымі вытворчымі рэкордамі, дапамогуць сотням, тысячам рабочых, якія ўпершыню прыдуць на торфараспрацоўкі, асвоіць сацыялістычныя нормы працы.

І. ТУРЗЦКІ.

78-гадовы калгаснік сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны будаўнік» Камарынскага раёна тав. Нежыхоўскі С. Ю. ужо 6 год працуе ў калгасным кузні. У 1936 г. ён выпрацаваў 371 працадзень. Тав. Нежыхоўскі і ў гэтым годзе па-баявому працуе над рамонтам сельскагаспадарчых машын і прылад. На здымку: тав. Нежыхоўскі завяршае рамонт сельскагаспадарчых машын. Фото Цалуйка (БСФ).

Вытворчыя поспехі стахановаў Мозыра

МОЗЫР. (Па тэлефону). 3 вялікай аку́ўнасцю абмяркоўвалі рабочыя мозырскіх прадпрыемстваў зварот данбасаўцаў. Стахановы і ўдарнікі адказваюць далейшым вышэннем прадукцыйнасці працы. Стаханаўка фанернага завода «Чырвоны Карычнік» Фрыман Ліза 4 сакавіка выканала 120 лістоў фанеры замест нормы 75.

Пыркуляршчыца мяблевай фабрыкі «Профінтэрн» Чарняўская выканала ў тры дзень норму на 283 проц. Такой выпрацоўкі ў яе яшчэ ніколі не было. Чарняўская абавязалася давесці выпрацоўку трох норм і стаць трохсотнікам.

Прыкладу Чарняўскай следуюць і іншыя работніцы фабрыкі. Нядаўна маляршчыца Савалава Тоня выконвала норму на 180 проц., 4 сакавіка яна дала 228 проц.

Перадавая брыгада хлебазавода Дубровка 5 сакавіка выканала план на 190 проц. У гэтай брыгадзе няма ні аднаго рабочага, які-б не перавыконваў сваёй нормы.

Абмеркаванне звароту данбасаўцаў суправаджаецца ў цэхах і брыгадах разгортваннем социялістычнага спаборніцтва, узяццем шэфства стахановцамі над адстаючымі рабочымі па асваенню тэхнічных норм.

ФРАЛОЎ.

КАЛГАСНЫЯ СНАЙПЕРЫ

З 20 на 28 лютага праходзілі ўсесаюзныя завочныя спадчыўна-стралковыя спаборніцтвы калгасных каманд, прысвечаныя дню Чырвонай Арміі. Лепшыя паказчыкі па БССР дала каманда калгаса «Звязда» Станькаўскага сельсовета, Дзержынскага раёна. З 250 магчымых ачкоў каманда выбіла 239. Калгаснік Нікалай Каржанеўскі выбіў 50 ачкоў з 50 магчымых, калгаснік Нікалай Арцюшэўскі выбіў 49 ачкоў.

У Чачэрску ігнаруюць аднаасобнікаў

У канцылярыю Глыбоцкага сельсовета, Чачэрскага раёна прыйшоў аднаасобнік Адаменкаў Фёдар. У яго паў конь, ён звярнуўся за дапамогай.

— А грошы прынёс? — першае пытанне было да аднаасобніка з боку рахункавода сельскага совета.

Фёдар Адаменкаў пазбягаў прынесці грошы на гэтых-жа днях, а зараз-жа ён звярнуўся за дапамогай — гаспадарка асталася без каня.

Здавалася-б, работнікі сельсовета пагутараць з ім, параюць 70-гадовага старыка, што яму рабіць. Але ніхто не звярнуў на яго ўвагі. Толькі тое зрабілі, што пасадзейнічалі атрымаць страхоўку за паўшага каня.

— А чаму вам, дзед Фёдар, не пайсці у калгас?—запыталіся мы ў аднаасобніка Адаменкава. — У калгасе-б вы мелі многа хлеба, апрача гэтага па новай Сталінскай Канстытуцыі страшэнныя прагаздольнасць у калгасе аказваецца дапамога праз касы ўзаемадапамогі.

З далейшай гутаркі высвятляецца, што аднаасобнік Адаменкаў Фёдар нават не ведае аб Канстытуцыі, з ім ніхто аб гэтым Асноўным Законе не гаварыў не растлумачыў артыкул Канстытуцыі аб дапамозе совецкім грамадзянам у выпадку старасці або страты працаздольнасці.

У паселішчы, дзе жыве Адаменкаў, сярод аднаасобнікаў сельскі совет не праводзіць амаль ніякай работы. Сходы ніколі не склікаюцца, важнейшыя мерапрыемствы комуністычнай партыі і совецкай улады не даводзяцца да аднаасобнікаў. Члены сельскага совета прыходзяць на паселішча толькі тады, калі трэба давесці і спагнаць сельскагаспадарчы падатак.

У адным такім паселішчы «Першамайск» налічваецца 31 аднаасобная гаспадарка. Сельскі совет лічыць гэтых аднаасобнікаў акуратнымі плацельшчыкамі. Па гэтай прычыне тулы радка хто заглядае і масава-растлумачальнай работы не праводзіць. У выніку гэтага за ўсё гады у калгас не ўступіла ні адна гаспадарка.

У Глыбоцкім сельсовеце ёсць 130 аднаасобнікаў, што складае 18 проц. усіх сялянскіх гаспадарак. Калгасы, як і сельсовет, на іх не звяртаюць увагі. Вось чаму аднаасобнікі не ведаюць аб Сталінскай Канстытуцыі, аб статуце сельскагаспадарчай арцелі, дзе яскрава сказана пра дапамогу старым. Яны не ведаюць аб касах узаемадапамогі ў калгасах.

У Чачэрскім раёне яўна ігнаруюць аднаасобнікаў. Факты, прыведзеныя з практыкі работы Глыбоцкага сельсовета, характэрны для ўсяго раёна.

Ні раённыя арганізацыі, ні сельсоветы, ні праўленні калгасаў не акружылі ўвагай аднаасобнікаў не прыцягнулі іх бліжэй да калгаса. Райвыканком і райком партыі не налічыў патрэбным арганізаваць сярод аднаасобнікаў вывучэнне даклада таварыша Сталіна, і Сталінскай Канстытуцыі.

Замест масавай работы сярод аднаасобнікаў у асобных сельскіх советах дапускаецца грубае парушэнне Сталінскай Канстытуцыі. 21 студзеня прэзідыум райвыканкома разглядаў заяву аднаасобніка вёскі Валасовічы. Нісімкаўскага сельсовета — Лапухава Фёдара. Сельскі совет незаконна забраў у яго хату. Гэта было зроблена пасля таго, калі была зацверджана Канстытуцыя Саюза ССР.

Прэзідыум райвыканкома вынес рашэнне—вярнуць хату Лапухову Фёдару. Старшыні сельсовета Балыкову вынеслі суровую вымову. На гэтым справа скончылася. Урокам для іншых сельсоветаў справа гэта не з'явілася. Вось чаму і зараз у Закрынічным, Беляеўскім, Халошкім, Меркулавіцкім і інш. сельсоветах паўтараецца незаконнае ізаляцыя маёмасці ў аднаасобнікаў.

Адміністраванне, грубае парушэнне Сталінскай Канстытуцыі ў Чачэрскім раёне ўвайшло ў сістэму. Яшчэ чуем нядаўна тут адбывалася нечуваная справа. У Закрынічны сельсовет прыехаў упаўнаважаны камітэта загатовак Ліпскі. Ён загадаў старшыні сельсовета Гуркову і парторгу Шабалаеву склікаць у сельсовет усіх аднаасобнікаў і калгаснікаў, якія не разлічыліся з дзяржавай. Калі яны прышлі, Ліпскі, Гуркоў і Шабалаеў запэрлі іх у хлеў і трымалі пад вартай на працягу некалькіх гадзін. Да гэтага варта дадаць, што Ліпскі ўвесь час разгульваў з рэвальверам на многіх паселішчах і пагражаў аднаасобнікам на кожным кроку.

Раённая партыйная і совецкая арганізацыі да гэтага часу не вынеслі з гэтай справы патрэбнага ўроку. Па-ранейшаму тут адны размовы, а сапраўдная работы з аднаасобнікамі няма. Ніхто не клапоціцца дапамагчы аднаасобніку хутчэй уступіць у калгас.

А. ЛОСЬ.

ЛЕПЕЛЬСКІЯ УНТЭР-ПРЫШЫБЕЕВЫ

(З залы суда)

ЛЕПЕЛЬ, 9 сакавіка. (Ад спец. кар. «Звязды», па тэлефону). 5 былых кіраўнікоў Лепельскага раёна — першы і другі сакратары райкома партыі Пацэнгель і Юшкевіч, старшыня райвыканкома Семашка, загадчык райфа Русанаў і ўпаўнаважаны камітэта загатовак Міхайлаў прадсталі сёння перад выязной сесіяй Вярхоўнага суда БССР. Разам з імі, зусім дастойны сваіх калег, на лаве падсудных былы старшыня Стайскага сельсовета Гайсёнак. Абвінавачанне заключэнне разгортвае жудасны малюнак грубейшага парушэння революцыйнай законнасці, злоснага напірання правоў совецкіх грамадзян, абураючых злоўжыванняў людзей, якім партыя і ўрад даверылі кіраўніцтва адным з пагранічных раёнаў ордэнаноснай БССР.

Уся наша краіна ў 1936 годзе з захапленнем абмяркоўвала і зацвярджала Сталінскую Канстытуцыю — вялікую хартыю правоў вызваленага чалавецтва. А ў гэты час у сельсоветах Лепельшчыны з благаславення і пры непасрэдным удзеле раённых кіраўнікоў праводзіліся незаконныя масавыя вобыскі і штрафы і адбранне маемасці ў калгаснікаў і аднаасобнікаў. Усё гэта рабілася пад шырмай «барацьбы за выкананне плана ільнозагатовак» Семашка патрабаваў ад старшынь сельсоветаў цвёрдага правядзення ў жыццё сваіх дырэктыў. Калгаснікі сельгасарцелі імя Тэльмана, Ляхаўскага сельсовета Бародзіч і Канішаў не дазволілі рабіць у сябе вобыскаў. Калі старшыня сельсовета Акарцаў паведаміў аб гэтым па тэлефону Семашка, апошні загадаў яму асабіста выехаць на месца і правесці вобыск.

Асаблівую актыўнасць у беззаконнях і нечуваных здзеках над насельніцтвам праяўляў старшыня Стайскага сельсовета Гайсёнак, які ахвотна праводзіў у жыццё дырэктывы Семашка, Юшкевіча, Русанава і інш. 22 верасня мінулага года ён адабраў у аднаасобніка Жарнасек Ільі за не ўплату штрафу 160 руб. усё, што палалася пад рукі. У вопісі забранай маемасці сярод іншых рэчаў лічыцца: спадніца, кофта, адзін армяк і адна пара панчох, ручнікі, брукі, мяшок і т. д. У гэтага аднаасобніка 5 студзеня Гайсёнак зноў адабраў маемасць за няплоймку ў 50 руб. За калгаснікам Мазго Васілём лічылася няплоймка ў 7 руб. За гэта Гайсёнак забраў у яго падушку. На ёй спалі дзеці Мазго. Але гэта не спыніла бяздушнага дзяржыморду Гайсёнка, — ён выцягнуў падушку з-пад галавы дзяцей. Выконваючы з тупым спакоем дырэктывы начальства, Гайсёнак ні з чым не лічыўся. Забіраў апошні піжак у калгасніка, здзіраў з плеч 10-гадовага хлапчука ўдавы Зернасек старую жалетку.

Адбіралі маёмасць не толькі ў не выконваўшых пастаўкі. Аднаасобнік Мазго Пётр у 1936 годзе поўнасцю выканаў усе абавязацельствы перад дзяржавай. Не гледзячы на гэта, Гайсёнак па ўказанню Семашка і Юшкевіча правялі на прэзідыуме сельсовета пастанову аб аштрафаванні Мазго на 40 руб. У той-жа дзень Гайсёнак прыйшоў да Мазго ў хату і забраў тынель яго сына-чырвонаармейца—палаўнак камандзіра часці. Пенсіянерка Азаронак Анна была аштрафавана Гайсёнкам на 50 руб. «за нядзачу бульбы», хоць задання па бульбапастаўках яна і не атрымлівала. Для характарыстыкі штрафной палітыкі лепельскіх злачынцаў даволі сказаць, што агульная сума штрафаў па Стайскаму сельсовету, накладзеных Гайсёнкам, амаль роўна суме падатковых абкладанняў. Сістэма незаконных штрафаў, вобыскаў, адабранне маемасці, панавала і ў Пышнянскім, Свяцкім, Засяльнянскім, Замошкім, Ляхаўскім і інш. сельсоветах. Галоўным натхняцелем іх злачынстваў з'яўляўся старшыня РВК Семашка, які афіцыяльна патрабаваў ад старшынь сельсоветаў «рашучых дзеянняў». На спецыяльна скліканай раённай нарадзе Семашка даў дырэктыву старшыням сельсоветаў аб правядзенні масавых вобыскаў у калгаснікаў і аднаасобнікаў. Каб гэтыя вобыскі фармальна апраўдаць, яны павінны былі праводзіцца пад выглядам санітарных, процінажарных абследванняў хат і надворных пабудоў. Семашка дзейнічаў не толькі на сваю ўласную рызыку. Гэта ўстаноўка на незаконныя вобыскі і адабранне маемасці была санкцыянавана сакратарамі райкома партыі Пацэнгалем і Юшкевічам.

Раённае начальства, аднак, не абмяжоўвалася толькі дырэктывамі. Яно паказвала і «асабістыя прыклады» — як ажыццяўляць гэтыя дырэктывы. 2 студзеня Семашка і Юшкевіч разам з Гайсёнкам прышлі ў хату да аднаасобніцы Бабровіч і адабралі за няплоймку ў 108 руб. усё, што было ў хаце. Яны не пагарджалі ні чым: забралі 1 кілаграм фасолі, 4 кілаграмы ячменных груп, соль і інш. маемасць. Усё гэта адбіралася на заніжанаму кошту і незалежна ад сумы няплоймак.

Усе гэтыя факты сведчаць аб парушэнні Сталінскай Канстытуцыі унтэр-прышыбеевымі і палітычнымі злачынцамі з РК і РВК, якія дзейнічалі метадамі класавага ворага.

Уся дзейнасць гэтых антысовецкіх людзей была па сутнасці стаўкай на лыскрэдытацыю совецкай улады і падрыў калгаснага будаўніцтва, стаўкай на палітычнае шкодніцтва.

Але стаўка гэта біта. Вораг пасаджан на лаву падсудных.

***

Зала лепельскага кінатэатра, дзе слухаецца справа, перапоўнена калгаснікамі і аднаасобнікамі. Прапоўныя раёна праяўляюць выключную цікавасць да працэса. У зале прысутнічаюць лепшыя стахановы старыя і моладзь калгасных палёў, радавыя калгаснікі і брыгадзіры, 70-гадовы вартаўнік калгаса «Прапаўнік» Свяцкага сельсовета Мільчанікаў, 80-гадовы калгаснік Егор Карабанаў і маладая стахановка-палявод Зіна Дзімітрычонак з калгаса «Новае жыццё», Свяцкага сельсовета. У зале сядзяць дзесяткі людзей, якія непасрэдна пярпелі ад свавольства, грубага адміністравання былых кіраўнікоў раёна. Пярпелі і маўчалі, бо скарэйшца было небяспечна, гэта пагражала новымі вобыскамі і здзекамі.

З нянавісцю і абурэннем яны глядзяць на лаву падсудных, на кучку злачынцаў, якія тэрарызавалі насельніцтва, карыстаючыся сваім службовым становішчам. Сёння прапоўныя Лепельшчыны яшчэ раз пераканаліся ў цвёрдасці і непахіснасці асноўнага закона совецкай дзяржавы вялікай Сталінскай Канстытуцыі, 10-ы артыкул якой гаворыць: «Права асабістай уласнасці грамадзян і ўсіх прапоўных на іх працоўныя даходы і зберажэнні, на жылы дом і падсобную хатнюю гаспадарку, на прадметы хатняй гаспадаркі і ўжытку, на прадметы асабістага спажывання і таксама права наследвання асабістай уласнасці грамадзян—ахоўваецца законам». Яны яшчэ раз пераканаліся, што совецкая ўлада нікому не дазволіць беспакарана парушаць Сталінскую Канстытуцыю, попіраць правы совецкіх грамадзян.

Першым дапытваецца былы старшыня Стайкаўскага сельсовета Гайсёнак. Гэта—пражжоны прайдзісвет, кваліфікаваны ілгун і очкаўпірацель. Ён не ўпершыню стаіць перад пролетарскім судом, у мінулым годзе Гайсёнак быў асуджан на 8 месяцаў прымусовай працы за очкаўпірацельства ў часе ўборкі, незаконныя масавыя штрафы. Ён добра разумеў, што ўсе гэтыя штрафы, вобыскі і адбіранне маёмасці — злачынства і беззаконне. Ён быў першым выканаўцам волі рабічага начальства і ніпто не магло яго спыніць. Недарма Семашка і Пацэнгель не кантралявалі работу Гайсёнка, яны верылі яму, як свайму чалавеку. Былі ўпэўнены, што ён «не падвядзе».

Два гады працаваў Гайсёнак старшынёй сельсовета, і вось на судзе высвятляецца адна маленькая дэталь: Гайсёнак не вёдае, колькі ў сельсовеце аднаасобнікаў. Гэта ярка характарызуе якасць работы Стайкаўскага сельсовета. «Ні адна з 9 секцый сельсовета не працавала, бо не ўмелі арганізаваць іх работу»,— гаворыць Гайсёнак.

Старшыня: — Не ўмелі, ці не прабавалі?

Гайсёнак: — Не ўмелі і не прабавалі.

Адзіным метадам былі вокрыкі, штрафы, адміністраванне; штрафаванне захлестала кіраўнікоў сельсовета. Штрафавалі за няяўку на дзяжурства, за неразноску пакетаў, за непаведамленне школы і т. д. і неадкладна пасля абкладання штрафа рабілася адбіранне маёмасці. Бывала і так, што маёмасць апісвалася авансам у лік... будучых штрафаў.

На судзе выявілася яшчэ адна характэрная рыса бясслаўнай дзейнасці Стайкаўскага сельсовета. Адабраная ў калгаснікаў і аднаасобнікаў незаконна і па заніжаных цэнах маёмасць не прадавалася з таргоў каму-небудзь, а рэалізавалася сярод актыва сельсовета. «Актывісты» ахвотна набывалі за бясцэнак тое, што прадаваў шчодры старшыня.

Па старой прывычцы Гайсёнак і на судзе рознымі спосабамі імкнецца ўперці ачкі, выкруціцца ад непрыемных паказанняў.

Ён часта прыкідваецца Іванам няюмнячым, але перакрыжавальны агонь пытанняў старшыні суда тав. Абушкевіча, пракурора тав. Глейзерава прыціскае яго да сценкі. Ён прымушан «успомніць», як прысвоіў 100 руб. штрафу, узятых з двух калгаснікаў «за нядзачу малака». Гайсёнак вылаў калгаснікам уласную расціску без квітанцыі, паклаў грошы ў кішэню, «забыўся» аформіць.

Другім на першым пасяджэнні суда дапытваўся былы ўпаўнаважаны камітэта загатовак Міхайлаў. Ён, Міхайлаў, прызнаў сябе вінаўным у прадаўленым яму абвінавачванні. Гэта ён сам, шырока практыкуючы накладанне штрафаў, даваў з іншымі кіраўнікамі раёна такія-ж дырэктывы старшыням сельсоветаў. Ён, таксама як і іншыя, быў у захапленні ад «цвёрдай лініі» Пацэнгеля і Семашка.

С. ГАЛКІН.

ПАЛІТЫЧНЫЯ СЛЯПЦЫ

У канцы снежня 1936 года Наркамфін ССР рабіў рэвізію палатковай работы ў Суражскім раёне. Рэвізіяй устаноўлены гіднейшыя факты парушэння революцыйнай законнасці сельсоветамі, райфа і самім РВК.

У Суражы выпрацавалася свая «суражская законнасць» — законнасць, варожая палітыцы партыі і совецкай уладзе, варожая совецкаму заканадаўству. Яна звялася да беспадстаўных абкладанняў сельніцтва непамернымі падаткамі, да гэтага адміністравання і прамых здзекаў над працоўнымі.

Абкладанне саматужнікаў падаходным падаткам і культзборам рабілася райфа без папярэдняга выяўлення і ўстанаўлення іх даходаў. Нормамі даходнасці, устаноўленымі Наркамфінам, у Суражы не кіраваліся. Падатак вылічваўся самавольна. Прыкладу райфа следвалі і сельсоветы. Так, гаспадарка Эгліт Альмы складаецца толькі з 0.25 га сядзібы, аднак гэта не перашкодзіла Янавіцкаму сельсовету «ўлічыць» у гэтай гаспадарцы 3 тысячы рублёў рыначных даходаў і налічыць падатак у суме 682 руб. Так рабілі і іншыя сельсоветы.

Выкананне фінплана ў Суражскім раёне не забяспечвалася разгорнутай масава-палітычнай работай. Тут не прывыклі прапаваць метадамі пераканання. З пасельніцтвам у Суражы размаўляюць мовай дзяржымоды, вокрыкам, загадамі. Следуючы дырэктывам РВК, сельсоветы пачалі з адміністрацыйным запалам, вартым лепшага прымянення, спаганяць падатак.

Рэвізіяй устаноўлены масавыя факты незаконных вопісаў і адбірання маемасці. Адабраная маемасць часта не афармлялася адпаведнымі актамі і прападала невядома куды. Частка адабранай маемасці перападала членам і работнікам сельсоветаў па казачна нізкіх цэнах. У сваім адміністрацыйным захапленні старшыні сельсоветаў не спыняліся перад распродажам нават рэчаў хатняга ўжытку, вопраткі, прадаваліся і апошнія хаты.

У грамадзянкі Эгліт Альмы Янавіцкі сельсовет за няплоймку па незаконна накладзенаму сельгаспадатку ў 682 руб. адабраў: хату з прыбудовай, хлеў, карову, цёлку, свінню, калёсы, сена, салому, швейную машыну, камод і пяць пароженіх мяшкоў. Уся гэта маемасць, нават па цэнах сельсовета, ацэньвалася ў 1.810 руб. Для чаго, як не для дыскрэдытацыі совецкай падатковай палітыкі і законаў патрабавалася распрадаваць маемасць, у тры разы перавышаючую суму незаконна накладзенага падатку.

У грамадзяніна Шаршнёва Грыгора за няплоймку ў 79 руб. 75 кап. старшыня таго-ж Янавіцкага сельсовета Кавалёў пралаў: хату, лазню, парасе, аўцу, калоду пчол, 15 пудоў буракоў, хлеў, павень, 100 пуд. сена і дзве шафы — усяго, па ацэнках сельсовета, на суму 925 руб. За невыкананне плана веснавой сяўбы сельсовет 12 мая 1936 года адабраў у грамадзяніна Новікава Рыгора каня, вупраж, азімае жыта, 2 пулы 20 фунтаў ячменю, пералок ад калёс.

Такім-жа незаконным шляхам Янавіцкі сельсовет адабраў хаты ў аднаасобнікаў Заблоцкага Алеся, Дубава Івана, Іванова Ілы, Шаршнёва Грыгора, Акунёва Аляксандра, Акунёва Фёдара і Эгліт Альмы.

Запольскі сельсовет адабраў у грамадзяніна Нікіціна Сямёна галошы, ацэненыя ў 5 руб., кофту — у тры руб., плашчэ— у 10 руб., паліто — у 25 руб. У Брылёвай Марыны 11 снежня адабрана без акта 11 аўчын, 16 метраў сукна, ацэненыя сельсоветам на 6 руб. за метр, 4 аўцы, 7 ягнят, цёлка, істопка і 100 пудоў сена. Уся гэта маемасць невядома куды падзелася. У грамадзяніна Дзмітрачонка Ніла намеснік старшыні сельсовета Сазонік забраў нават сабаку.

Частка незаконна адабранай маемасці перападала і раённым арганізацыям. Так, адабраныя ў грамадзяніна вёскі Пеклавічы Батаніцкага сельсовета Сінякова Якава хата, конь і карова аказаліся прысвоенымі раённымі арганізацыямі. Хату забрала сабе бясплатна міліцыя, конь і карова былі па распараджэнню РВК перададзены бясплатна раённым арганізацыям.

Усе гэтыя абураючыя факты антысовецкай работы суражскіх арганізацый дакладна ўстаноўлены рэвізіяй яшчэ ў снежні 1936 года. Здавалася-б, што неабходна было тэрмінова выправіць дапушчаныя грубейшыя парушэнні совецкіх законаў, прыцягнуць віноўных да стражэйшай судовай адказнасці. Фактычна-ж ні Наркамфін, ні консультант Соўнаркома, які атрымаў гэту справу, за 2,5 месяцы не «паспелі» яшчэ прыняць хоць якія-небудзь меры да парушальнікаў совецкіх законаў.

Наркамфін на працягу больш месяца вёў бясплодную перапіску з суражскім РВК аб меры пакарання віноўных. Прастафілям з Наркамфіна не ўпрыцям было, што Суражскі РВК, які ў сваёй рабоце кіраваўся сваёй «суражскай законнасцю» і сам не менш чым сельсоветы віноўны ў парушэнні совецкіх законаў, не здолеў наогул выправіць памылкі і прыцягнуць віноўных да адказнасці, бо гэта азначала-б, што ён сам сябе павінен пасадзіць на лаву падсудных. Упаўніўшыся праз месяц у беспрадметнасці гэтай перапіскі, работнікі Наркамфіна асмяліліся, нарэшце, 5 лютага напісаць аб усім гэтым у Соўнарком дакладную запіску, а 9 лютага Наркамфін унёс на разгляд СНК праект пастановы па суражскай справе, і на гэтым ён палічыў сваю місію скончанай.

Консультант Соўнаркома аб суражскай справе даведаўся яшчэ ў студзені з прысланай пастановы суражскага РВК. Але ён не прыдаў гэтаму сур'ёзнага палітычнага значэння. Пастанова была проста перадасавана Наркамфіну. Нават дакладная запіска, прысланая 5 лютага Наркамфінам, не вывела са стану роўнавагі і не ўзварушыла консультанта СНК. Консультант Соўнаркома тав. Петрушэня, якому была даручана суражская справа, амаль пэлы месяц збіраўся выклікаць да сябе старшыню суражскага РВК Асмалоўскага для атрымання ад яго тлумачэнняў (быццам мала было матэрыялаў і фактаў без гэтых тлумачэнняў?!). Нарэшце, 21 лютага адбылася сустрэча Петрушэні з Асмалоўскім. Справа дапоўнілася яшчэ адным дакументам — тлумачэннямі Асмалоўскага. Чаго-ж больш трэба? Аднак, з таго часу прайшло яшчэ 17 дзён, а справа ўсё яшчэ не вырашана, яна і дагэтуль чакае сваёй чаргі.

А тым часам пакрыўджаныя грамадзяне Суражскага раёна безрэзультатна абіваюць парогі раённых і цэнтральных устаноў, незаконна адабраная маемасць ім не звернута, совецкія законы з-за палітычнай слепаты паасобных работнікаў СНК БССР астаюцца парушанымі.

СТОЛІН.

Усебеларуская нарада работнікаў прамысловасці будматэрыялаў

Учора вечарам у Доме тэхнікі адкрылася ўсебеларуская нарада работнікаў прамысловасці будматэрыялаў Наркаммясцпрома БССР. На нарадзе прысутнічае 150 чалавек: дырэктары, тэхнарукі, стахановы прадпрыемстваў.

З дакладам аб рабоце прамысловасці будматэрыялаў за 1936 год і далейшых яе задачах па выкананню плана 1937 года выступіў нарком мясцовай прамысловасці тав. Балцін.

На вячэрнім пасяджэнні выказаліся ў спрэчках тт. Лаўрэнчук—цагельны завод № 3 (Менск), Бранд — завод № 18 (Петрыкава), Станкевіч — завод № 8 (Магілеў), Блох — завод № 9 (Магілеў) і інш.

На нарадзе будуць працаваць дзве секцыі: па цагельна-чарапічнай прамысловасці і прамысловасці вязучых і аблицовачных будматэрыялаў. На секцыях будуць заслуханы даклады па пытаннях: кар'ернай гаспадаркі, сушыльнай, фармовачнай, унутрызаводскага транспарту, арганізацыі працы і інш.

Да першага тыража пазыкі другой пяцігодкі

МАСКВА, 9 сакавіка. (БЕЛТА). 25 мая 1937 г. у Маскве адбудзецца першы тыраж пазыкі другой пяцігодкі (выпуск чацвертага года).

Закладзеныя ў ашчадкасах аблігацыі гэтай пазыкі не будуць прымаць удзелу ў тыражы. Каб забяспечыць іх удзел у тыражы, пазыкатрымальнік павінен пагасіць выданую яму ашчадкасай пазыку і атрымаць свае аблігацыі на рукі.

Раздача аблігацый на новай падпісцы на пазыку рабочым і служачым будзе праведзена пры выдачы зарплаты за другую палову красавіка.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

Напружаныя баі ў раёне Гвадалахары

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 9 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Іспаніі, учора войскі мяцежнікаў прадпрынялі жорсткае наступленне ў гвадалахарскім сектары. (Гвадалахара — горад на паўночным ўсходзе ад Мадрыда). Пасля артылерыйскай падрыхтоўкі мяцежнікі перайшлі ў наступленне пры падтрымцы танкаў. Процівапанкавыя гарматы рэспубліканцаў зараз-жа адкрылі агонь і ім удалося затрымаць прасоўванне мяцежнікаў. Пасля першай няўдачы мяцежнікі пусцілі ў ход авіяцыю. 9 трохматорных бамбардыроўшчыкаў, ахоўваемых эскадрыллямі знішчальнікаў, бамбардзіравалі газіцы і тыл рэспубліканцаў. Зенітныя гарматы і знішчальнікі рэспубліканцаў прымусілі авіяцыю праціўніка ўцякаць.

У 11 гадзін раніцы калі першая спроба мяцежнікаў скончылася няўдачай, артылерыя мяцежнікаў зноў адкрыла агонь, і пяхота мяцежнікаў адначіла атаку пад прыкрыццём артылерыйскай агнёвай заслоны.

Аднак атака зноў была адбіта рэспубліканцамі. Пасля кароткага замірання мяцежнікі пачалі трэцюю атаку на тымж участку. На гэты раз артылерыя рэспубліканцаў адкрыла бесперапынны агонь па наступаючых войсках праціўніка, а таксама па іх тылавых пазіцыях з метаю перашкодзіць падцягванню падмацаванняў.

Мяцежнікі дарэмна імкнуліся прасунуцца ўперад. Агонь кулямётаў рэспубліканцаў аламаў усе іх спробы. Зголк апошніх вестак, атака мяцежнікаў адбіта ўсюды.

Учора мяцежнікі дарэмна атакавалі чатыры разы пазіцыі рэспубліканцаў (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) у раёне ракі Харамы. Рэспубліканцы аказалі ўпартае супраціўленне. У 17 гадзін па мясцовым часу яны перайшлі ў контратаку. Баі пагнуліся да наступлення ночы.

ПЛЕНУМ ЦК ІСПАНСКАЙ КОМПАРТЫІ

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 8 сакавіка. (БЕЛТА). На вячэрнім пасяджэнні пленума ЦК іспанскай компартыі, якое адбывалася 7 сакавіка, адначіліся спрэчкі па дакладу генеральнага сакратара компартыі Хозе Дыяса.

Міністр асветы Эрнандэс ахарактарызаваў фашысцкіх генералаў і папоў як прамых пасляднікаў старой сярэдневяковай рэакцыйнай Іспаніі і на радзе яркіх гістарычных прыкладаў паказаў што Франко і К° толькі капіруюць старыя змрочныя ўзоры іспанскага і германскага сярэдневякоўя. Ён расказаў, якія намаганні прыкладае, не глядзячы на цяжкую ваенную абстаноўку, рэспубліканскі ўрад, каб узняць культурны ўзровень народных мас, каб наблізіць да народу лепшыя дасягненні іспанскай і міжнароднай культуры.

Намячаючы задачы народнага фронта ў галіне культуры, Эрнандэс указаў на прыклад Совецкага Саюза, дзе культура з'яўляецца ўсеагульным здабыткам.

Бальестэрос, рэдактар цэнтральнага органа партыі «Мундо обрэро», цяпер у сутнасці франтавой газеты, якая выходзіць за якіх-небудзь 2 кіламетры ад лініі агню, расказаў аб рабоце рэдакцыі і аб тым, якое значэнне гэта газета мае для абаронцаў і насельніцтва іспанскай сталіцы (па свайму штодзённаму тыражу да 80 тыс. экз. «Мундо обрэро» цвёрда заняла першае месца сярод мадрыдскіх газет).

Пленум заслухаў прывітанне Політа — генеральнага сакратара ПК англійскай компартыі, які адзначыў, што іспанскі рабочы клас упісаў самую слаўную старонку ў гісторыю пролетарскай барацьбы апошняга дзесяцігоддзя.

У ЛОНДАНСКІМ КАМІТЭЦЕ

Фашысцкія дзяржавы сабатуюць ажыццяўленне кантролю

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 8 сакавіка. (БЕЛТА). На пасяджэнні падкамісіі камітэта па неўмяшанню 6 сакавіка вялікія дэбаты выклікала пытанне аб кантролі Канарскіх астравоў (астравы знаходзяцца ў Атлантычным акіяне на захад ад Афрыканскага матарыка, якія знаходзяцца, як вядома, у руках генерала Франко. Эксперты пры энергічным націску з боку совецкіх прадстаўнікоў уключылі Канарскія астравы на агульных падставах у план кантролю. Паколькі блізка ад іх няма ніякага «нейтральнага» порта, было пастаноўлена, што група кантралёраў будзе крэйсіраваць на спецыяльным судне камітэта па-за тэрытарыяльнымі водамі Канарскіх астравоў і караблі, якія будуць ісці туды, будуць браць кантралёраў з гэтага плывучага «кантрольнага пункта».

На пасяджэнні падкамісіі 6 сакавіка лорд Плімут рашуча выступіў супроць праекта экспертаў, указваючы, што ўтрыманне «плывучага отэля», як ён выказаўся, у раёне Канарскіх астравоў значна павялічыць расходы камітэта. Германскі і італьянскі дэлегаты энергічна падтрымалі Плімута і сталі даказваць, што кантроль Канарскіх астравоў наогул не патрэбен.

Аднак, прадстаўнік СССР тав. Майскі катэгарычна патрабаваў уключэння Канарскіх астравоў у агульны план кантролю, і было пастаноўлена, што Канарскія астравы, побач з усімі астатнімі часткамі іспанскай тэрыторыі, падлягаюць кантролю з боку камітэта.

На пасяджэнні падкамісіі 5 сакавіка, у часе абмеркавання пытання аб «нейтральных портах», у якіх суднам, што ідуць у Іспанію, павінны браць на борт кантралёраў, адбыўся інцыдэнт, які вельмі ўсхваляваў членаў падкамісіі. У ліку названых портаў ёсць таксама два партугальскія — Лісабон і Малэйра. Прадстаўнік Партугаліі Мантэйро нечакана заявіў, што ні пры якіх умовах совецкія судны не могуць быць дапушчаны ў партугальскія порты. Тады прадстаўнік СССР тав. Майскі ў сваю чаргу заявіў, што, як яму ўжо неаднаразова і раней прыходзілася падкрэсліваць, нармальная работа камітэта магчыма толькі на базе роўнапраўя ўсіх яго членаў. Паколькі партугальскі ўрад хоча стварыць асобы дыскрымінацыйны рэжым у адносінах суднаў СССР, ён вымушан настойваць на тым, каб партугальскія порты наогул былі выключаны з ліку «нейтральных портаў», у якіх устанаўліваюцца кантрольныя пункты камітэта.

На працягу ўсяго дня 6 сакавіка за кулісамі падкамісіі ішлі жвавыя дыпламатычныя перагаворы, якія к вечару прывялі да наступных рэзультатаў. Лорд Плімут, як старшыня, заявіў на пасяджэнні падкамісіі, што выступленне партугальскага дэлегата 5 сакавіка не мела ніякіх адносін да разбіраўшагася пытання і таму павінна разглядацца, як неіснуючае. Мантэйро далучыўся да гэтай думкі старшыні і заявіў: «Таго, што было ўчора, больш няма». Тады тав. Майскі адказаў: «Калі таго, што было ўчора, больш няма, то няма таксама і маёй прапановы (г. зн. прапановы аб выключэнні партугальскіх портаў), якая была ўнесена ўчора». На гэтым інцыдэнт быў прызнан вычарпаным, і падкамісія ў хуткім часе пасля гэтага закончыла сваё абмеркаванне плана морскага і сухапутнага кантролю.

З прычыны цяжкасцей, якія фашысцкія дзяржавы стваралі ажыццяўленню справы кантролю, пачатак ажыццяўлення гэтага кантролю, прадугледжаны рашэннем камітэта ад 16 лютага ў ноч з 6 на 7 сакавіка, аказаўся немагчымым. З прычыны гэтага, згодна прапановы французскага дэлегата Карбена, падкамісіяй 6 сакавіка было пастаноўлена, каб агенты камітэта на сухапутных гранічах Іспаніі, а таксама ваенныя судны дзяржаў, якія прымаюць удзел у морскім кантролі (Англія, Францыя, Германія і Італія) былі на месцах у сваіх зонах 13 сакавіка. Аднак, ёсць шмат падстаў думаць, што ў сілу розных тэхнічных прычын фактычнае ажыццяўленне кантролю пачнецца не раней 20 сакавіка.

ІТАЛІЯ БУДУЕ АУТАДАРОГІ У СВАІХ КАЛОНІЯХ

РЫМ (сталіца Італіі), 8 сакавіка. (БЕЛТА). Заўтра Мусаліні ў суправаджэнні світы адпраўляецца ў доўгае падарожжа ў Лівію (італьянская калонія ў паўночнай Афрыцы), дзе будзе адкрыта аўтадарога ўздоўж міжземнаморскага ўзбярэжжа ад граніц з Тунісам (французская калонія) да Егіпта даўжынёю каля 2 тыс. кіламетраў. Зусім відавочна, што дарога пабудавана перш за ўсё з ваенна-стратэгічных меркаванняў.

Аўтадарога, як указваюць у кампетэнтных колах, дасць магчымасць італьянскім уладам хутка перакідаць войскі ў тыя месцы, дзе яны патрабуюцца, для «аднаўлення парадку». Не меншае значэнне дарога будзе мець «у выпадку патрэбы» і для дзеянняў супроць Егіпта і Французскага Туніса.

Арышты комуністаў у Чэхаславакіі

ПРАГА (сталіца Чэхаславакіі), 7 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе орган компартыі «Рудэ право», днямі паліцыя зрабіла вобыск ў памяшканні краявога сакратарыята комуністычнай партыі Чэхаславакіі ў Кладно (Чэхія) і адвезла ўсіх супрацоўнікаў сакратарыята на допыт. Пасля допыту арыштаваны па падазрэнню ў вярбоўцы добраахвотнікаў для арміі рэспубліканскай Іспаніі сакратар краявога камітэта Наўрацід, старшыня фабзаўкома вялікага металургічнага завода «Польдыхютэ» Звонарж і два рабочыя.

Апрача таго, як паведамляе газета «Венкоў», у горадзе Мост арыштаваны тры члены компартыі па абвінавачванню ў тым, што яны нібыта хацелі пераправіць у Іспанію некалькі завербаваных імі гарнякоў. У Гразцеп-Кралове, згодна паведамлення «Рудэ право», зноў арыштован сакратар краявога камітэта компартыі Тэсла.

У Кладно ў паліцыю з'явілася дэлегацыя рабочых «Польдыхютэ» і іншых металургічных заводаў Кладно, патрабуючы неадкладнага вызвалення арыштаваных. Гарняжы на шахце «Майрау» арганізавалі бурную дэманстрацыю пад лозунгам: «Не дапусцім больш арыштаў за дапамогу дэмакратычнай Іспаніі. Мы ўсе на баку Іспанскай рэспублікі».

Рэжым паліцэйскага насілля і свавольства

ВАРШАВА (сталіца Польшчы), 9 сакавіка. (БЕЛТА). Выступіўшая ўчора на пленарным пасяджэнні польскага сената (верхняй палаты) пры абмеркаванні праекта бюджэта міністэрства ўнутраных спраў жанчына-сенатар Флешэр назвала існуючы ў Польшчы рэжым паліцэйскім, пры якім, паводле яе слоў, адносіны ўлады да насельніцтва вызначаюцца толькі загадамі і забаронамі.

Флешэр падкрэсліла, што асабліва яркае ў вочы паліцэйскае свавольства ў галіне друку і прафесіянальных саюзаў. Яна настойвала на расследаванні становішча ў канцэнтрацыйным лагеры Бяроза-Картуска і паведаміла, што рад сенатараў і міністраў атрымалі ад блізкіх сваякоў палітзняволеных калектыўную скаргу на зверскае абыходжанне ў гэтым канцлагеры.

Забастоўкі на аўтамабільных заводах ЗША

НЬЮ-ЁРК (буйнейшы цэнтр ЗША) 8 сакавіка (БЕЛТА). Сёння ў Дэтройце (ЗША) аб'явілі забастоўку звыш 50 тысяч рабочых аўтамабільных прадпрыемстваў. Бастуючыя занялі 5 прадпрыемстваў фірмы «Крэйслер» пасля таго, як гэта фірма адмовілася прызнаць профсаюз аўтамабільных рабочых, які ўваходзіць у камітэт вытворчых профсаюзаў. У сувязі з забастоўкай спынена работа таксама на прадпрыемствах фірмы «Гудзон», дзе занята 10 тыс. рабочых. Бастуючыя патрабуюць перагавораў адміністрацыі з профсаюзам.

Шасцідзесяцігадовая калгасніца калгаса «Ленінская свабода» Пухавіцкага раёна т. Івашка Елізавета Макараўна, лепшая рукадзельніца ў раёне па вышыўцы ўзораў. НА ЗДЫМКУ: т. Івашка з узорамі сваіх вырабаў.

Фото Гнядзько (БСФ).

МОЛАДЗЬ, НА АЎТАМАБІЛЬ!

Камітэт па справах фізкультуры і спорта пры СНК БССР прызнаў зусім правільнай крытыку газеты «Правда» дрэннага кіраўніцтва з боку камітэта развіццём аўта-мотаспорта ў Беларускай рэспубліцы. Падзючы выключна велізарнае палітычнае значэнне прапанове героя Совецкага Саюза т. Ляпідзеўскага аб масавым развіцці аўтамабільнага спорта і падрыхтоўцы ў нашай краіне 500—600 тыс. вадзіцеляў аўта-мотамашын і ўлічваючы асаблівае значэнне развіцця гэтага спорта ў Беларускай рэспубліцы, камітэт пастанавіў неадкладна прыступіць да арганізацыі ў Менску Цэнтральнага аўта-мотаклуба, якому камітэт перадае тры аўтамашыны, два матацыклы, занараджаныя 2 грузавыя аўтамашыны, а таксама гараж і майстэрню.

На арганізацыю клуба камітэт адпускае з свайго бюджэта 100 тысяч рублёў. Гэта апрача 137 тысяч рублёў, ужо адпушчаных урадам спецыяльна на арганізацыю аўта-мотаклуба. Перад клубам ставіцца задача падрыхтаваць у 1937 годзе вадзіцеляў аўтамашын, аўтаспартсменаў і матацыклістаў.

Пры камітэце стварацца аўта-мотасекцыя. Такія-ж секцыі будуць створаны пры добраахвотных спорттаварыствах «Дынама», «Спартак», «Тэмп» і «Харчавік», пры менскім, віцебскім, гомельскім, бабруйскім, магілеўскім, барысаўскім і аршанскім камітэтах па справах фізкультуры і спорта. Менскі, віцебскі і гомельскі камітэты павінны на гэту справу вызначыць свае бюджэты па 15 тысяч рублёў, бабруйскі, аршанскі, барысаўскі, магілеўскі — па 10 тыс. рублёў.

Беларускі камітэт абавязаў мясцовыя камітэты і добраахвотныя спартыўныя таварыствы зараз-жа арганізаваць на прадпрыемствах, у навучальных установах і МТС гурткі па падрыхтоўцы шофераў і матацыклістаў аматараў. Камітэт раніцу увесці ў Беларускім дзяржаўным тэхнікуме фізкультуры спецыяльны курс па вывучэнню студэнтамі аўта-мотаспорта.

ЦЫВЕС.

Перасоўка пяц'паверховага будынка ў Менску

Інжынеры Белдзяржпраекта тт. Казінец і Фальберг распрацоўваюць праект перасоўкі пяціпавярховага Дома металістаў № 24 у Менску па Совецкай вуліцы супроць Дома ўрада. Гэта будзе першым у БССР вопытам перасоўкі будынкаў. Дом металістаў намечана перанесці прыблізна на 130 метраў у бок на ўчастак паміж Земляробчым завулкам і Базарнай вуліцай. Адрыў будынка ад фундамента будзе зроблен пры дапамозе 100—150 домкратаў, а сама перасоўка—пры дапамозе домкратаў па рэйках. Участак, дзе цяпер знаходзіцца Дом металістаў, пасля пераноскі дома будзе выкарыстаны для пашырэння плошчы перад Домам урада.

Перасоўка будынкаў асабліва шырока практыкуецца ў ЗША. У апошні час гэта пачынае практыкавацца і ў СССР. У Маскве створан спецыяльны трэст.

Праект будзе закончан у сярэдзіне красавіка. Перасоўку Дома металістаў намечана правесці летам бягучага года.

М. КІН.

ЗАКРЫЛАСЯ НАРАДА ЖАНОЧАГА СОВЕЦКАГА АКТЫВА

Учора на наразе жаночага совецкага актыва працягваліся спрэчкі па дакладзе старшыні ЦВК БССР тав. Чарвякова. Выступілі: тт. Рэўтовіч (Дзержынскі раён), Ганс (Бешанковіцкі пасавет), Міхайлава (Мехаўскі раён), Камякова (Жлобін), Лесніцкая (Копыль), Палітаковіч (Гомель), Палявая (Барысаў), Бялевіч (Віцебск) і інш.

Усе яны расказалі аб сваёй рабоце ў секцыях і дэпутацкіх групах, аб вырашэнні актыўнасці прадпоўнай жанчыны. Многія ўказвалі на рад недахопаў мясцовых кіраўнікоў, якія недаацэньваюць роль жанчыны ў рабоце советаў.

Усяго выказалася ў спрэчках каля 4 чалавек. На наразе ўвесь час прысутнічаў старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў.

У канцы раніцняга пасяджэння выступіў з прамовай сакратар ЦВК БССР тав. Ляўкоў.

На вячэрнім пасяджэнні пасля работы секцый нарада закончылася.

КІНО

„Апошняя ноч"

(Новы мастацкі гукавы фільм вытворчасці «Мосфильм»)

З учарашняга дня ў Менску пачаў дэманстравацца выдатны фільм «Апошняя ноч». Гэта першы фільм, прысвечаны 20-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі і героічна загінуўшым змагарам за свабоду і шчасце працоўных.

Гэта фільм аб кастрычніцкіх днях 1917 года ў Маскве. Падзеі разгортваюцца на працягу адной ночы. Рэалістычная праўдзіва на мастацкіх вобразах двух сем'яў — рабочага Захаркіна і фабрыканта Леонцьева—паказана гістарычны пераварот.

Класавы лёс двух сем'яў знаходзіць у рэвалюцыі складанае перапляценне. Адна з іх—сям'я Захаркіна—рашуча змагаецца за рэвалюцыю, другая сям'я — Леонцьева — супроць рэвалюцыі. Поўна кроўныя вобразы членаў як адной, так другой сям'і. Артысты здолелі раскрыць унутраны змест, імкненне і жаданне кожнага з іх. Папаўшыйся ў палон да юнкераў, якія захапілі ў гэтую памятную ноч на некалькі мінут гімназію і адпусцілі рабочыя атрады, старык Захаркін трымае сябе моцна, не падае духам, прамагаецца дзіць у вочы смерці. Агаліўшы грудзі, ён гнеўна крычыць у свіное рыла фабрыканта Леонцьева: «Мяне цяпер не загнеш, я цяпер разагнуўся. Страляй у рэвалюцыю, толькі ўсёроўна яе не заб'еш».

Вобраз валявога камандзіра рабочых атрадаў і салдат, пасля перайшоўшых на бок рэвалюцыі, Пятра Захаркіна настолькі хвалюючы, настолькі просты і прывабны, што хочацца сказаць: так, рэвалюцыю рабілі лепшыя людзі рабочага класа на чале з Леніным і Сталіным.

Няма сумнення, што і вобраз кіраўніка ўсіх участкаў паўстання, большэвіка, старшыні рэўкома Міхайлава (майстэрскі выкананы артыстам) увойдзе ў кінамастацтва, як самы яркі, праўдзівы вобраз лепшых людзей пролетарскай рэвалюцыі. Яго прамова пасля захопу Бранскага вакзала ручыць з выключнай сілай дзе надзвычайную зарадку, веру ў перамогу справы знамянальнай кастрычніцкай ночы:

— «Яшчэ многа такіх начэй наперадзе. Вышэй галавы, мацней вінтоўкі! Вечная ненавісць да ворага!»

Фільм змяшчае ў сабе выключна моцныя кадры калектыўных сцэн — барацьбы рабочых з капіталістычнымі наёмнікамі, барацьбы моцнай і крывавай, але гэта барацьба прыемная, бо яна прынесла працоўным волю, шчасце, радаснае жыццё. Яна была неабходнай. Мы зараз сведкі тых вялікіх заваяванняў, якія яна прынесла ўсім, хто любіць сваю радзіму, сваю партыю, сваіх правадыроў.

«Апошняя ноч» — твор выключнай сілы. У ім глядач убачыць жывыя малюнкі Кастрычніцкіх баёў у Маскве, убачыць людзей, каваўшых нам шчасце, і яшчэ больш будзе ненавідзець ворагаў партыі і рабочага класа.

Непадкупная ў шчырая ігра артыстаў, удалая музыка, рэжысерскае майстэрства, малюнкі Масквы — усё гэта робіць фільм выключна змястоўным і цікавым. Яго велізарнае значэнне наш совецкі глядач ацаніў з першага дня.

П. КАВАЛЕЎ.

НОВЫЯ КНІГІ

Ф. БЭКОН

Дзяржаўнае сацыяльна-эканамічнае выдавецтва выпусціла кнігу С. Субоціна аб Бэконе.

У кнізе дан кароткі нарыс жыцця і вучэння роданачальніка англійскага матэрыялізма Ф. Бэкона. На фоне сацыяльна-эканамічных і палітычных умоў Англіі канца XVI і пачатку XVII стагоддзя паказана роля Бэкона ў развіцці вучэння аб матэрыі, эмпірычных навук і індукцыйнай логікі (розумазаключэнні, праз якія ад прызнання прыватных з'явішчаў пераходзяць да прызнання агульнага меркавання), а таксама месца філасофіі Бэкона ў гісторыі філасофіі і прыродазнаўства.

Цана кнігі 2 р. 20 к.

Ад Рагачоўскага РК КП(б)Б

Украдзены партбілет, выданы Рагачоўскім РК КП(б)Б за № 0860927 на імя Крымскага Шаі Беркавіча, лічыць несапраўдным.

Сакратар Рагачоўскага РК КП(б)Б ТАМІЛІН.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ ГЕМАТАЛОГІІ і пераліванння крыві

склікае

2-ю НАВУКОВУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ

КАНФЕРЭНЦЫЯ АДКРЫВАЕЦЦА Ў 6 ГАДЗІН ВЕЧАРА 11 САКАВІКА Ў ПАМЯШКАННІ 1 КОРПУСА КЛІНІЧНАГА ГАРАДКА І ПРАЦЯГНЕЦЦА 11, 12 І 13 САКАВІКА.

УВАХОД ПА ЗАПРАШАЛЬНЫХ БІЛЕТАХ.

ДА ЎВАГІ ГАСПАДАРНІКАЎ!

У рамонтных майстэрнях МЕНГОРСОВЕТА

ЗНАЧНА ЗНІЖАНЫ АДПУСКНЫЯ ЦЭНЫ НА РАМОНТ

ПІШУЧЫХ МАШЫНАК І АРЫФМОМЕТРАЎ

(АД 10 ДА 25 ПРОЦ.) НА 1937 г.

ЗАКАЗЫ ВЫКОНВАЮЦЦА АКУРАТНА, У ТЭРМІН І З ГАРАНТЫЯЙ.

ТЭРМІНОВЫЯ ЗАКАЗЫ ВЫКОНВАЮЦЦА У 2—3 ДНІ

ДРОБНЫЯ ЗАКАЗЫ выконваюцца НА МЕСЦЫ па выкліку механіка (тэл. 22-302)

ПРЫМАЮЦЦА ТАКСАМА ЗАКАЗЫ НА РАМОНТ КАСАВЫХ АПАРАТАЎ, ШЧОТНЫХ МАШЫН «ДСМ», ВЕЛАСІПЕДАЎ, НІКЕЛІРОЎКУ І ЎСЯКІЯ ТАКАРНА-МЕХАНІЧНЫЯ І КАВАЛЬСКІЯ РАБОТЫ, А ТАКСАМА І НА МЕДНАЕ ЛІЦЦЕ.

АДРАС МАЙСТЭРАНЬ: МЕНСК, КОМСАМОЛЬСКАЯ, 2/15, тэл. 22-302. МЕНСК, НЯМІГА, 37, тэлефон 22-137

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛЕФОНУ № 21-845

УСЕ НА ВЫСТАЎКУ! УСЕ НА ВЫСТАЎКУ!

З 12 ВЕРАСНЯ (вул. Кірава, 12, БЕЛШВЕЙТРЭСТАМ

У КЛУБЕ МЕТАЛІСТАЎ (радам з стадыёнам „ДЫНАМА") АДКРЫВАЕЦЦА

—ВЫСТАУКА—

МАДЭЛЯЎ ФАСОНАЎ ШВЕЙНЫХ ВЫРАБАЎ | МУЖЧЫНСКАГА, ЖАНОЧАГА І ДЗІЦЯЧАГА АСАРТЫМЕНТУ

ДЛЯ ЗАЦВЕРДЖАННЯ НА АСЕННЕ-ЗІМОВЫ СЕЗОН 2-га ПАУГОДДЗЯ 1937 г.

ВЫСТАЎКА БУДЗЕ АДКРЫТА ШТОДЗЕННА ДА 21 САКАВІКА г. г. З 11 гадзін РАНІЦЫ да 11 гадзін ВЕЧАРА.

ПРЫ ВЫСТАЎЦЫ працуюць ЭКСКУРСАВОДЫ | ПРЫ ВЫСТАЎЦЫ працуе ВЕШАЛКА. УВАХОД ВОЛЬНЫ.

БЕЛШВЕЙТРЭСТ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1) ЯК ЯЕ ЗАВУЦЬ Абанемент № 68.

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР ЗАКАТ Абанемент № 87

Гукавы кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ВОРКА» ДАРЫКО

Дзіцячы гукавы кінатэатр САПРАЎДНЫ ТАВАРЫШ

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» АПОШНЯЯ НОЧ

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал» ЮНАЦТВА МАКСІМА

Гукавы кінатэатр «Спартак» ДЗЯЎЧЫНА СПЯШАЕЦЦА НА СПАТКАННЕ

ЛЕКТОРЫЙ ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ ТЭХНІКІ (Комсамольская, 25, Тэл. 21-727, 24-788)

У сакавіку будзе прачытан ЦЫКЛ ЛЕКЦЫЙ ПА АСТРАНОМІІ:

12 сакавіка — Будова і развіццё сусвету.
17 сакавіка — Ці ёсць жыццё на планетах?
18 сакавіка — Заваяванне стратасферы і міжпланетныя падарожжы.

Лекцыі чытае лектар Маскоўскага планетарыя тав. А. Б. ПАЛЯКОЎ.

23 сакавіка пачынаецца чытанне цыкла лекцый ПА НАВУЦЫ І ТЭХНІЦЫ.

Абанементы і разавыя білеты прадаюцца ў канцылярыі Дома тэхнікі штодзённа з 2 да 4 гадзін дня, апрача дзён пасля агульных выходных, а таксама ў дзень лекцыі з 6 гадзін вечара.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 11 САКАВІКА

8.30—«Апошнія паведамленні». 12.30 — завочная партвучоба; 16 — выступленне Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР. мантаж п'есы Бабеля «Закат». 17 — перадача для дзяцей. 18.30 — завочная партвучоба. 19.45 — маладыя выканаўцы ля мікрафона. 20 — навіны навукі і тэхнікі. 20.15 — канцэрт з твораў прафесара Залатарова. 20.45 — рускія і беларускія народныя песні; 22 — музыкальна-літаратурная перадача. 23 — «Апошнія паведамленні».

Галоўная кантора вучэбна-педагагічнай літаратуры

ВЫХОДЗІЦЬ У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС З ДРУКУ КНІГА, ПРЫСВЕЧАНАЯ ПАМЯЦІ Марыі Валадзіміраўны ПРОНІНАЙ

УЧПЕДКНИГА

НЮРЫНА Ф. Е. І КУРЦІК А. М. Замечательная дочь великого народа. Аб'ём 4 друк. арк. Ц. арыент. 1 р. 50 к.

ПРОДАЖ ВА ЎСІХ МАГАЗІНАХ І КІЁСКАХ КОГИЗ'а.

Наложаным плацяжом высылае аддзел «Книга — почтой» в усіх абласных і краявых аддзяленнях КОГИЗ'а.

Да ведама ўрачоў і лекавых устаноў.

ДАВОДЗЯЦЦА ДА ВЕДАМА ЎРАЧОЎ НАСТУПНЫЯ ВЫТРЫМКІ З ЗАГАДУ НК АХОВЫ ЗДАРОЎЯ СССР АД 2 СНЕЖНЯ 1936 г. ЗА № 120 АБ ПАРАДКУ ВОДПУСКУ З АПТЭК ЛЯКАРСТВАЎ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ЯДАВІТЫЯ АБО МОЦНА ДЗЕЙНІЧАЮЧЫЯ СРОДКІ.

§ 5. Усе лякарствы, у саставе якіх уваходзяць ядавітыя або моцнадзейнічаючыя вяшчэствы (перасе або ў сумесі), адпускаюцца з аптэк выключна па рацэптах урачоў.

У рацэптах, якія маюць ядавітыя або моцнадзейнічаючыя сродкі, урач абавязан указаць, апрача спосабаў ужывання і ўзрост хворага, калі хворы маладзей 18 год. або старэй 60 гадоў. Пры ўказанні спосабаў карыстання нельга абмяжоўвацца агульнымі выразамі: «наружнае», «унутранае», «ужываць як сказана» і т. д., неабходна дакладна ўказаць частату прыёму і дозу (напрыклад: па 1 стал. ложцы 4 разы ў суткі і т. д.).

§ 6. Лякарствы, якія маюць ядавітыя вяшчэствы, моцнадзейнічаючыя наркатычныя сродкі, дзіяталіс і яго прэпараты, не могуць быць адпушчаны з аптэкі паўторна без подпісу ўрача, калі на рацэпце няма подпісу ўрача «паўтараць без подпісаў», або ўказання, колькі разоў паўтараць лякарствы без подпісу.

§ 7. Лякарствы, якія маюць моцнадзейнічаючыя вяшчэствы, за выключэннем указаных у § 6, калі яны прапісаны ў дозе менш палавіны выпадковага аднаразовага прыёму, могуць быць адпушчаны паўторна без подпісу ўрача на рацэпце (сігнатуры), калі на рацэпце няма з боку ўрача спецыяльных указанняў аб недапушчальнасці паўтарэння гэтых лякарстваў.

§ 18. На рацэптах, якія маюць наркатычныя прэпараты: морфій, опій, опійная настойка і экстракт, героін, дзіанін, пантапон, какаін, як у чыстым выглядзе, так і ў сумесі, павінна быць апрача подпісу ўрача таксама асабістая пячатка ўрача або установы, якой ён працуе.

КАБ ПАЗБЕГНУЦЬ НЕПАРАЗУМЕННЯЎ, ЯКІЯ МОГУЦЬ МЕЦЬ МЕСЦА ПРЫ ЗАКАЗАХ У АПТЭКАХ ЛЯКАРСТВАЎ ПА РАЦЭПТАХ, У ЯКІХ НЕ ЗАХАВАНЫ ЎСТАНОЎЛЕНЫЯ ПРАВІЛЬЫ ПРАПІСВАННЯ ЯДАВІТЫХ І МОЦНАДЗЕЙНІЧАЮЧЫХ ВЯШЧЭСТВАЎ, ЎРАЧАМ НЕАБХОДНА ДАКЛАДНА ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА ЎКАЗАНЫХ ПРАВІЛ, А ТАКСАМА ТЭКСТ РАЦЭПТА І ПОДПІС ПАВІННЫ БЫЦЬ РАЗБОРЛІВЫ, УЛІЧВАЮЧЫ, ШТО АПТЭКАМ ДАНО КАТЭГАРЫЧНАЕ ЎКАЗАННЕ — ЛЯКАРСТВЫ ПА НЯПРАВІЛЬНА АФОРМЛЕНЫХ РАЦЭПТАХ НЕ АДПУСКАЦЬ.

БЕЛАПТЭКАКІРАЎНІЦТВА.

Уп. Галоўлітбела № К—586. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. К. К. С.